Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך!
Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

# САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЭЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЕЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ РАБОЧЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ПАНЯДЗЕЛАК
13 ліпеня 1931 г.
№ 159 (3248)

## Сталінскае слова ў дзейнасьці

У сваёй гістарычнай прамове на нарадзе гаспадарнікаў тав. Сталін паставіў перад усёй нашай краінай 6 задач, ажыцьцяўленьне якіх павінна забясьпечыць нам поўнае выкананьне прамфінпляну 3-га рашаючага году пяцігодкі, павінна забясьпечыць ліквідацыю адставаньня некаторых галін нашай прамысловасьці.

Гэтыя ўмовы зводзяцца ў асноўным да таго, каб, па-першае, перайсьці да палітыкі арганізаванага набору рабочых для прамысловасьці, перайсьці да мэханізацыі найбольш цяжкіх працэсаў працы.

Па-другое, гэтыя ўмовы заключаюцца ў тым, каб ліквідаваць цякучасьць рабочай сілы, замацаваць рабочых за прадпрыемствам, правільна арганізаваць заработную плату і палепшыць бытавыя ўмовы работы.

Трэцяй умовай, якая забясьпечвае выкананьне пляну, зьяўляецца ліквідацыя абязьлічкі ў прамысловасьці накшталт таго, як ліквідавана абязьлічка на чыгуначным транспарце, лепш арганізаваць працу на вытворчасьці, больш правільна расставіць людзей і машыны.

Па-чацьвертае, неабходна разгортваць рашуча і сьмела вырашчваньне вытворча-тэхнічнай інтэлігенцыі рабочае клясы.

Па-пятае, трэба зьмяніць адносіны да старых тэхнічных спэцыялістаў, больш сьмела прыцягваць іх да работы, больш чула адносіцца да іх, аддаваць ім больш увагі, абкружаць іх заботай. І па-шостае, трэба ўкараніць цьвёрды гаспадарчы разьлік на прадпрыемстве, перавесьці на справе на гаспадарчы разьлік кожную частачку заводзкага арганізму, разгарнуць сапраўды бальшавіцкімі тэмпамі ўнутрыпрамысловае накапленьне для далейшай шпаркай індустрыялізацыі нашай краіны.

Гэтыя 6 умоў, аб якіх гаварыў тав. Сталін, яны зьяўляюцца праграмай базавых дзеяў, праграмай бальшавіцкай барацьбы за нашы пляны.

І рабочая кляса адказвае свайму правадыру сапраўды бальшавіцкімі справамі. Заводы і фабрыкі з цэху ў цэх, з агрэгату ў агрэгат, з зьмены ў зьмену нясуць у масы рабочае клясы заклік правадыра. На нашых вачох прамова Сталіна ператвараецца ў рэальную справу, будучы падтрымана шырачэзнымі мільённымі масамі.

Бліскучы ўзор бальшавіцкай перабудовы ў сувязі з прамовай правадыра партыі, паказвае Ленінградзкі мэталёвы завод імя Сталіна. Прамова Сталіна была абгаворана тут на шматлікіх рабочых сходах, на сходах высокаразрадных майстроў і брыгадзіраў, і завод у адказ распрацаваў плян канкрэтных дзеяў.

Так, напрыклад, вось як рашыў завод арганізаваць набор рабочай сілы. Завод будзе вербаваць калгасьнікаў у тых мясцох, дзе распачынаюць пабудову турбіных заводаў, з гэтых калгасьнікаў падрыхтуе ў сябе кадры для будучых заводаў і такім чынам праз 3 гады завод дасьць новым волатам індустрыі кваліфікаваныя нацыянальныя пралетарскія кадры.

Завод абвясьціў самую лютую барацьбу супроць абязьлічкі і абгаварвае пытаньне аб тым, як ліквідаваць абязьлічанасьць майстра ў цэху, як майстра зрабіць сапраўдным гаспадаром цэху. Завод разгарнуў барацьбу за правільную арганізацыю сыстэмы заработнай платы. Рашуча ўводзіцца на заводзе прэміяльная сыстэма, прэміяльна-прагрэсыўная аплата, перагляданцца тарыфныя нормы інжынэраў, майстроў... Словам завод рашуча бярэцца за перабудову сыстэмы заработнай платы гэтага важнейшага рычага барацьбы за прамфінплян.

Вопыт Ленінградзкага мэталёвага заводу імя Сталіна, вопыт, аб якім рабочыя заводу расказваюць у сваім адкрытым лісьце да рабочых заводаў і фабрык усяго Савецкага Саюзу, павінен быць падхоплены ўсёй рабочай клясай. Прамова тав. Сталіна павінна быць даведзена да кожнага рабочага. Кожны рабочы павінен быць у радох актыўных барацьбітоў за поўнае выкананьне ўмоў, аб якіх гаварыў т. Сталін. Канвэерам прапаноў, новым уздымам працоўнага энтузіязму, новай хваляй ударніцтва і саспаборніцтва—павінна адказаць рабочая кляса правадыру сваёй партыі.

Сёньня мы паведамляем аб прыкладзе канкрэтнага ажыцьцяўленьня ўказаньняў тав. Сталіна на Менскім мэталюргічным заводзе імя Варашылава. Там зараз пачата масавая праверка перабудовы работы ўсіх грамадзкіх арганізацый. Там разгорнута кампанія за замацаваньне рабочых за прадпрыемствам. Трэба вітаць ініцыятыву кіраўнікоў заводу, пастанавіўшых прадставіць 100 дабудоўваючыхся кватэр тым рабочым, якія замацаваліся за прадпрыемствам. На заводзе імя Варашылава ўсе асноўныя брыгады пераводзяцца на прагрэсыўна-прэміяльную сыстэму заработнай платы, да 15 жніўня 90 проц. рабочых будуць пераведзены на зьдзельшчыну. Абвешчаны пяцідзёньнік умацаваньня ЗРК. Усё гэта гаворыць аб тым, што варашылаўцы пайшлі па правільным шляху, адказваючы на гістарычную прамову тав. Сталіна бальшавіцкімі справамі.

**Трэба шырэй разгарнуць фронт такіх адказаў. Трэба, каб кожны завод у бліжэйшы час мог рапартаваць аб сапраўднай перабудове ў сувязі з новымі задачамі гаспадарчага будаўніцтва.**

«Па новаму работаць, па новаму кіраваць»,—гэты баявы клічнавінен быць ажыцьцёўлены ў найкарочшы тэрмін. Заклік рабочых заводу імя Сталіна: «давайце бальшавіцкай самакрытыкай намацуем і выкрыем хваробы і недахопы нашых прадпрыемстваў. Давайце абдумаем усім пралетарскім калектывам як ужываць указаньні т. Сталіна ў кожнай галіне народнай гаспадаркі і ў кожным паасобным прадпрыемстве, цэху, брыгадзе»,—гэты заклік павінен быць падхоплены мільённымі рабочых павінен стаць выхадным пунктам барацьбы за поўнае выкананьне нашых пляноў.

Бальшавіцкае ажыцьцяўленьне ўказаных у прамове тав. Сталіна мерапрыемстваў забясьпечыць новыя буйнейшыя перамогі нашай партыі і рабочае клясы на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, на фронце завяршэньня фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР.

## УЧОРА НА ЗЬЕЗЬДЗЕ

◆ На ранішнім паседжаньні прачыталіся спрэчкі па дакладах т. т. Будзінскага і Курціка.

◆ Першым на ранішнім паседжаньні выступіла калгасьніца Барысаўшчыны тав. **Ермакоўч.**

— Мы, калгасьнікі, ведаем аб вялізарных дасягненьнях якіх дамагліся рабочыя на прадпрыемствах. Мы, калгасьнікі, на шырокіх калгасных палёх таксама на ўдарную змагаемся за хутчэйшае правядзеньне ўборкі ўраджаю, за хутчэйшае ажыцьцяўленьне пастаўленых партыяй задач.

◆ У трэцім рашаючым годзе мы павінны прыкласьці ўсе сілы на барацьбу за суцэльную пісьменнасьць у БССР,—высоўваюць задачу перад арміяй рабселькораў дэлегаты Зьезду.

◆ Прадстаўнік газэты «Віцебскі Пралетары» тав. **Рабсіхоўскі** перадаў зьезду прывітаньне ад 2.500 рабселькораў Віцебшчыны.

— Мы маем прыклад сапраўднай гераічнай барацьбы рабселькораў Віцебшчыны шляхам паказу асабістага прыкладу, як трэба змагацца на прадпрыемствах за выкананьне прамфінпляну.

— Віцебск мае і прарывы, ёсьць прадпрыемствы, якія поўнасьцю правалілі падрыхтоўку да рабселькоўскага зьезду.

◆ Тав. **Кішкевіч** (ваенкор) кажа — нашы ваенкоўскія брыгады за апошні час вырасьлі, ўзмацніліся і актывізаваліся ў барацьбе за выкананьне бальшавіцкіх тэмпаў па ўзмацненьні абароназдольнасьці Чырвонай армії.

— Нізавы друк вельмі мала зьвяртае ўвагі на пытаньні ваенізацыі насельніцтва, рабоце асоавіяхімаўскіх арганізацый. Цэнтральны друк таксама адстае, ён ня даў ніводнага агляду раённых газэт па гэтых важнейшых пытаньнях.

◆ З прывітаньнем ад імя ЦСПСБ на зьезьдзе выступіў заг. культсэктару ЦСПСБ тав. **Клімковіч.**

◆ Ад рабселькораў Заходняй вобласьці РСФСР зьезд вітаў **т. Емельяніну**, які заявіў, што рабселькорыя Заходняй вобласьці прымае выклік зьезду на сацспаборніцтва на пяршынства па ўборцы ўраджаю.

Прадстаўнік Культпропу ЦК КП(б)Б Украіны тав. Бабінец.

◆ Тав. **Чэрлін** (Гомельскі чыгуначнік) расказаў Зьезду аб барацьбе рабкораў чыгункі за рэканструкцыю транспарта. Але гэта барацьба разгорнута недастаткова і прадстаць яшчэ шмат работы.

◆ Дзякуючы цэнтральнаму і нізаваму друку, наш калгас імя Дзяржынскага пасьпяхова справіўся з задачамі весновай сяўбы, перавыкананае і пляны ўборкі ўраджаю загатовак,—кажа дэлегат **Гулевіч.**

— Але ў нас яшчэ ня ўсё добра са зьдзельшчынай, ёсьць прагульшчыкі. Трэба выканаць пастанову ЦК КП(б)Б і даць нашаму калгасу цыклограф для выданьня шматтыражкі, каб разгорнутай самакрытыкай мы маглі зьнішчыць недахопы і яшчэ больш пасьпяхова змагацца за генэральную лінію партыі.

◆ У выніку месячніка друку па Менску зараз налічваецца каля 1.000 насьценгазэт, маецца вялікі рост арміі рабкораў на прадпрыемствах. Але разам з дасягненьнямі Менск мае і рад буйных недахопаў: з боку асобных партячэек і фабзаўкомаў яшчэ не наладжана як належыць кіраўніцтва рабселькораўскай работай, на паасобных прадпрыемствах меліся выпадкі зажыму самакрытыкі,—гаворыць у сваім выступленьні т. **Герчыкаў** (Менгаркам КП(б)Б).

◆ Цэлы рад дэлегатаў у сваіх выступленьнях адзначалі, што некаторыя нізавыя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі чішэ стаяць у баку ад рабселькораўскага руху, ня кіруюць ім і не дапамагаюць у рабоце ударнікаў-рабкораў.

◆ З вялікай прамовай на ранішнім паседжаньні выступіў прадстаўнік ЦККК-НКРСІ **і. Гершман.**

◆ Тав. **Штопярук** (прадстаўнік рабселькораў Крыварожжа) падзяліўся са зьездам вопытам работы рэдакцыі аднэй з газэт Данбасу і работы рабселькораў Крыварожжа.

◆ Тав. **Меламед** (Рэчыца) заяўляе, што рабкоры Рэчыцы запажавых фабрык і фанэрнага заводу ўзялі абавязацельства ў падарунак Зьезду завербаваць 85 падпішчыкаў на «Рабселькор», 15 ударнікаў—ў партыю, 35 — у камсамол, арганізаваць 8 брыгад імя 2-га рабселькораўскага Зьезду, унесьці 6 рацыяналізатарскіх прапаноў.

— Усе гэтыя абавязацельствы мы ўжо выканалі, пад воплескі скончыў сваю прамову тав. Меламэд.

◆ Шмат хто з выступаўшых дэлегатаў Зьезду скардзіўся на тое, што яшчэ далёка не на належнай вышыні пастаўлена справа з рэагаваньнем на рабселькораўскія заметкі, што рэдакцыі газэт не скарыстоўваюць допісаў.

◆ На ранішнім паседжаньні выступіў прадстаўнік ЦК ЛКСМБ **т. Пэрлін**, якая спынілася на ролі камсамолу ў кіраўніцтве юнкораўскім рухам і на пытаньні ўзьняцьця актыўнасьці юнкораў у барацьбе за генэральную лінію партыі.

◆ Дэлегат тав. **Кагмаер** (завод «Камунар») адзначае, што вельмі мала ўвагі зьвяртаецца на работу сярод рабселькораў нацменшасьцяй. Трэба выправіць гэты недахоп.

## ВЯЧЭРНЯЕ ПАСЕДЖАНЬНЕ

◆ Воплескамі адобраньня сустрэў зьезд пры адчыненьні вячэрняга паседжаньня прапанову старшыньствуючай тав. Нікалаевай—не прагульваць, а працаваць па-ўдарнаму.

◆ Толькі перад зьездам разгарнулася работа брыгад, рэйду, кажа рабочы Віцебскага лесапільнага заводу. Зьезд замацуе рабселькоўскі рух.

◆ Тав. **Грынеўскі** на польскай мове заклікаў рабселькораў змагацца супроць заклятага ворага ў сутане—рэлігіі.

◆ Чырвонаармеец т. Богуш (АЬВШ) зазначыў: «Наш прамфінплян—здолець даць на сьпіне ў патрэбны момант ворагу—даведзен да кожнага байца. Наш прамфінплян мы выканаем!»

◆ Тав. **Клімовіч**—чыгуначнік даў абяцаньне—задачу падрыхтоўкі транспарту да асеньня-зімовых перавозак выканаць з гонарам, зьнішчыўшы абязьлічку, цераспалосіцу ў рэйках і іншыя недахопы.

◆ Палкае прывітаньне зьезду перадае ад прымежнага калгасу імя Валадарскага, Плешчаніцкага раёну, тав. **Пятровіч**, рапартуючы аб выкананьні пляну пасеву тэхнічных культур на 200 проц.

З рабселькорамі трэба,—кажа тав. Пятровіч,—павесьці штодзённую выхаваўчую работу, бо на яго зараз усклацдзена задача ня толькі адлюстроўваць, але і арганізоўваць масы, а ён часта сам малапісьменны рабочы з фабрыкі ці калгасьнік. Асабліва трэба зьвярнуць увагу на юнкораўскі рух.

◆ Газэтным кадрам, якія выкоўваюцца з нізоў трэба дапамагчы аўладаць тэхнікай,—зазначае рабкор паперовай фабрыкі «Чырвоная Зорка».

◆ Ударніца - калгасьніца калгасу «Ударнік». перадае пралетарскае прывітаньне зьезду ад калгасьнікаў.

◆ Мы не адыйдзем ад машыны, пакуль нашы пляны па торфараспрацоўках ня будуць выкананы, хоць зараз мы маем прарыў,—кажа тав. **Корзун.**

◆ Прывітаньне ад рабочых, служачых і тэхнічнага складу 1 раённай электрастанцыі імя Сталіна рабочым, сялянскім і вайсковым карэспандэнтам перадае тав. Булгакоў.

◆ Шчырае баявое чырвонаармейскае прывітаньне на украінскай мове перадаў зьезду член ураду БССР чырвонаармеец **Жалтоўскі** ад імя № Самарскай дывізіі імя ангельскага пралетарыяту.

— У адказ на прывітаньне зьезд паслаў тэлеграму слаўнай гэрачнай Чырвонай арміі ў асобе Рэвваенсавету СССР і БВА.

◆ Зьезду перадалі прывітаньні ад 2,500 ударнікаў і 300 рабкораў—ударнікаў Гомельскага паравоза-рамонтнага заводу, а таксама прадпрыемстваў Палесдруку, якое выканала пяцігодку за 2 з паловаю гады

◆ Магілеўская шаўковая фабрыка ў падарунак зьезду павялічыла рады рабкораў з 40 да 187 чалавек. У фонд друку засеяна фабрыкай у калгасах 20 га зямлі, з іх 4 га тэхнічных культур.

◆ Нязмоўнымі і доўгімі воплескамі сустрэў зьезд **старшыню СНК БССР тав. Галадзеда**, які выступіў з вялікай прамовай аб задачах рабселькоўскага руху.

— Ідзеце наперад пераможным маршам і мы пераможам,—закончыў сваю прамову тав. Галадзед.

— Наш лепшы адказ тав. Галадзеду—разьехаўшыся па мясцох, яшчэ больш змагацца за ажыцьцяўленьне задач партыі, за суцэльную калектывізацыю, за выкананьне прамфінпляну, запэўніў партыю і ўрад ад імя зьезду,—тав. Грышалевіч.—Занятых паэцый мы не здамо. Наш паравоз «Кастрычнік» пад кіраўніцтвам Камінтэрну пойдзе наперад і прыяшае вызваленьне для ўсяго сьвету.

**Пад гучныя доўгія воплескі Зьезд абіраў тав. Гея і тав. Галадзеда ганаровымі рабселькорамі.**

## Міжнародная хроніка

⊙ У Брэмене (Нямеччына) працягваюцца масавыя арышты рэвалюцыйных рабочых. Нядаўна арыштаваны акруговы кіраўнік юных піянэраў. У Лейпцыгу закончыўся працэс па справе аб сутычцы паміж фашыстамі і маладымі рабочымі, у часе якой фашысты забілі рабочага. Ня гледзячы на гэта, суд аслабаніў абвінавачаных фашыстаў. З падсудных—рабочых 6 прыгавораны да 2-х месяцаў турэмнага зьняволеньня кожны і адзін—да 1 месяца.

⊙ Прускі міністр унутраных спраў сацыял-дэмакрат Зэвэрынг выдаў новы загад аб правілах карыстаньня паліцыяй агнястрэльнай зброяй. У загадзе гаворыцца, што кожны паліцэйскі мае права пусьціць у ход зброю з мэтай «зламаць супраціўленьне дзействам ці для адбіцьця нападзеньня на паліцэйскага ці знаходзячых пад яго вартай асоб». У загадзе падкрэсьліваецца, штоі ўлада не адмовіць у абароне ніводнаму паліцэйскаму, які пусьціць у ход агнястрэльную зброю на аснове гэтага загаду.

Другі ўсебеларускі зьезд рабселькораў

# Зьезд перабудовы рабселькораўскага руху

**III-ці дзень**

**„Трэба пажадаць, каб усебеларускі зьезд рабселькораў пасьпяхова завяршыў агромністую работу, якая па сутнасьці ўжо вядзецца больш месяца, і падняць пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б рабселькораўскі рух у Беларусі на яшчэ больш высокую ступень („Правда")**

## Узор бальшавіцкага кіраўніцтва рабселькораўскім рухам

### Друк Беларусі перад усебеларускім зьездам рабселькораў

10-га ліпеня пачаў сваю работу ўсебеларускі зьезд рабселькораў.

Падрыхтоўка да гэтага зьезду ўзьнята на вялікую палітычную вышыню. У яе ўцягнуты ўсе кіруючыя арганізацыі, партработнікі прафработнікі, спэцыялісты, сотні і тысячы рабочых і калгасьнікаў, агульны і нізавы друк. Словам, без перабольшэньня можна сказаць, што ўся рэспубліка праяўляе вялікі інтарэс да скліканага рабселькораўскага зьезду і тых пытаньняў, якія будуць на ім абгаворвацца.

Арганізацыя такой падрыхтоўкі бясспрэчна зьяўляецца вынікам глыбокага разуменьня з боку партарганізацыі і друку Беларусі задач рабселькораў і нізавога друку ў рэканструкцыйны пэрыяд. Перадзьезьдаўская кампанія паказала, што партарганізацыі Беларусі на чале з сваім ЦК стаяць на вышыні палітычных задач і па-бальшавіцку праводзяць у жыцьцё дырэктывы ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькораўскага руху. Галоўнае ўсёй работы па скліканьні зьезду рабселькораў—у выкананьні пастановы ЦК ад 16 красавіка «аб перабудове рабселькораўскага руху» і ўстановак усесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху, аб ударніцтве ў друку, аб дыфэрэнцыяцыі кіраўніцтва і г. д. Беларускія партарганізацыі і газэты на справе паказалі, што яны ўмеюць на колькі правільна разумець указаньні ЦК, але і ўжываць іх у мясцовых канкрэтных абставінах, разьвіваць іх для палепшаньня работы з рабселькорамі на кожным канкрэтным вучастку, у кожнай галіне прамысловасьці і сельскае гаспадаркі. «Не кіраўніцтва «наогул», а сапраўднае канкрэтнае кіраўніцтва рабселькорамі»—вось баявы лёзунг беларускіх таварышоў.

У адпаведнасьці з гэтым лёзунгам сур'ёзна і паглыблена праводзіцца падрыхтоўка і паспрацоўка ўсіх пытаньняў зьезду, мабілізацыя ўвагі мас да яго.

З самых буйных мерапрыемстваў падрыхтоўкі да зьезду неабходна перш за ўсё адзначыць месячнік агляду і самаправеркі пралетарскага друку. Гэты месячнік праходзіў з 20-га мая па 20-га чэрвеня і давярнуў усю грамадзкасьць тварам да нізавой прэсы. Досыць сказаць, што пасьля спэцыяльнага ліста ЦК КП(б)Б на ўсіх партыйных ячэйках былі заслуханы даклады аб пастанове ЦК УсеКП(б) і справаздачы рэдактароў насьценгазэт, прыняты спэцыяльныя рашэньні аб узмацненьні кіраўніцтва нізавым друкам. У гэты-ж месячнік праведзены перавыбары рэдкалегій нізавога друку і ўзмоцнены кадры заводзкіх і саўгасна-калгасных газэт. ЦК КП(б)Б своячасова даў канкрэтны гэтага зусім правільную ўстаноўку:

«Перавыбары рэдкалегій павінны забясьпечыць ператварэньне брыгад друку ў вядучае зьвяно рабселькоўскага руху, узмацненьне рабселькоўскага руху як актыўнага правадніка генэральнай лініі партыі. Ні ў якім разе нельга забываць аб рабоце з рабселькорамі-адзіночкамі, якіх неабходна ўцягваць ва ўдарныя брыгады друку.

У рэдкалегіі насьценгазэт павінны абірацца лепшыя ўдарнікі, адданыя барацьбіты за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі».

Агляд — самаправерку праводзіў увесь друк Беларусі на чале са «Зьвяздой» і ўсебеларускай газэтай «Рабселькор». Партарганізацыі праводзілі месячнік праверкі, як важнейшую палітычную кампанію. ЦК КП(б)Б вынес рад спэцыяльных пастаноў у разьвіцьцё рашэньня ЦК УсеКП(б). Гэткія пастановы «аб раённым нізавым друку на мовах нацменшасьцяй», «аб папулярызацыі работ усесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькоўскага руху», «аб стварэньні аддзелаў ударных брыгад і рабселькораў і разьвіцьці ўдарніцтва ў друку» і г. д. партарганізацыі ў сваю чаргу разьвілі вялікую актыўнасьць.

Да месячніка былі выпушчаны спэцыяльныя лёзунгі. На месцы ЦК выслаў 20 сваіх інструктароў для дапамогі райкомам у правядзеньні самаправеркі. На аснове бальшавіцкіх рашэньняў і лёзунгаў ЦК КП(б)Б вышэйшая партарганізацыя, напрыклад, выклікала менскую на спаборніцтва па лепшым правядзеньні месячніка.

Гэтае спаборніцтва было падхоплена і многімі другімі райкомамі, якія ўзяліся па - сапраўднаму за справу разьвіцьця нізавой бальшавіцкай прэсы. Пралетары і калгасьнікі Беларусі таксама горача адгукнуліся на заклік партарганізацый і газэт. Сход рабочых заводу «Пралетары» заявіў:

«Дні, што засталіся да зьезду рабселькораў, эробім днямі баявога штурму прарыву, барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну».

«Сотні перадавых рабочых і калгасьнікаў уступілі ў рады ўдарнікаў друку для выкананьня гэтага абяцаньня».

У Віцебску, Рэчыцы, Полацку і іншых гарадох рабочыя адпрацавалі ў фонд пралетарскага друку па дзьве гадзіны. Калгасьнікі Магілеву, Полацку, Слуцку засеялі ў фонд друку—для разьвіцьця раённых, заводзкіх і калгасных газэт—«гектары друку»—і г. д. Беларускія партарганізацыі і газэты, такім чынам, дамагліся вялізарнейшых посьпехаў: узьнялі шырокія масы для будаўніцтва бальшавіцкай прэсы, для разьвіцьця ўдарніцтва ў друку. Трэба толькі гэту вялікую справу адпаведна замацаваць.

Ужо зараз ясна, што ўсебеларускі зьезд рабселькораў унясе ў арсэнал ўсяго рабселькоўскага руху вялікі ўклад па пытаньнях перабудовы руху. На зьезьдзе будзе мінімум агульных гутарак і кіпучая дзейнасьць па распрацоўцы канкрэтных задач рабселькораў для кожнай галіны прамысловасьці. За тры тыдні да зьезду ва ўсім беларускім друку, пачынаючы ад «Зьвязды» і канчаючы раённымі газэтамі, былі апублікаваны тэзісы для 9 сэкцый, якія будуць працаваць на нарадзе. Гэтыя тэзісы абгаворваліся на сходах рабкораў і ў рознастайных арганізацыях. Сэкцыі гэтыя (яны самі па сабе заслугоўваюць вялікай увагі) разьбіваюцца па галінным прынцыпе: па торфе, транспарце, лёне, жывёлагадоўлі, мэталі, каапэрацыі і г. д. У працоўку тэзісаў сэкцый быў уцягнуты вялікі актыў партыйных, савецкіх, прафсаюзных работнікаў, спэцыялістаў і г. д. Асабліва характарна, што ў складаньні тэзісаў прымалі ўдзел дырэктары буйнейшых прадпрыемстваў і 110 інжынэраў і тэхнікаў. Гэта бліскучы прыклад таго, як можна ажыцьцяўляць шчыльнейшую сувязь рабкораў са спэцыялістамі для вырашэньня задач аўладаньня тэхнікай у кожнай галіне прамысловасьці.

Найбольш цікава тое, што ў падрыхтоўку зьезду на справе ўцягнута 11 цэнтральных і 10 раённых газэт. Кожная газэта кіруе якой-небудзь сэкцыяй, вядзе абгаварэньне тэзісаў у масах, падпрацоўвае і зьбірае матэрыял. Часам друкаваліся сустрэчныя тэзісы ад імя рабочых, спэцыялістаў, прафработнікаў і г. д. Напрыклад, на нарадзе пратактыку ў беларускім бюро ЦК чыгуначнікаў былі высунуты сустрэчныя тэзісы аб рабоце рабселькораў-транспартнікаў. Яны ўнесьлі рад дадаткаў у першы праект і г. д.

У выніку такой сур'ёзнай работы, тэзісы набылі надзвычайна глыбокі і канкрэтны характар. Яны ўлічваюць кожную дэталь дзейнасьці рабкораў на вытворчасьці, умовы работы кожнай паасобнай прафэсіі і г. д. У тэзісах сэкцыі скурана-абутковай прамысловасьці маюцца, напрыклад, гэткія дыфэрэнцыяваныя ўказаньні рабкорам-ударнікам скураных заводаў:

«Хромаўшчыкі! Якасьць хрому патрабуе значнага палепшаньня. Рабселькор-ударнік павінен дамагацца, каб зольшчыкі палепшылі змазку, лепш шлагавалі скуру, дакладна ачышчалі падсед.

Сушыльнікі і перасыльнікі! Вы абвязаны пакончыць з перасушкай і недасушкай. Псаваньне тавараў у гэтых працэсах работы зьяўляецца вынікам няўважлівасьці, зьніжае вынікі сапраўднага ўдарніцтва.

Неадкладна рэкоўка цягне за сабой павялічэньне абрызваў, а значыць памяншае карысную плошчу скуры, павялічвае жорсткасьць тавараў».

Гэткія-ж канкрэтныя ўказаньні з вучотам работы кожнай прафэсіі даны рабкорам абутнікам, закройшчыкам, загатоўшчыкам, пашыўшчыкам і інш. Тэзісы па іншых галінах прамысловасьці складзены па такім-жа прынцыпе.

Такім чынам, прапрацованы тэзісы сапраўды зарадзяць рабселькораў праграмай палітычнай барацьбы за кожны канкрэтны вучастак у кожнай галіне прамысловасьці. Газэты «Зьвязда», «Рабочай», «Бальшавік Барысаўшчыны», «Камунар Магілеўшчыны», «Палеская Праўда», «Ленінскі заклік», «Чырвоная Зьмена», «Віцебскі Пралетары» і інш. робяць шмат чаго для сапраўднага забясьпечаньня менавіта такой работы сэкцый.

Трэба раўнацца па беларускіх партарганізацыях і друку ў справе перабудовы рабселькоўскага руху.

Трэба пажадаць, каб усебеларускі зьезд рабселькораў пасьпяхова завяршыў вялізарнеўшую работу, якая па сутнасьці ўжо праводзіцца больш месяца і ўзьняць пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б рабселькоўскі рух Беларусі на яшчэ больш высокую ступень.

## Аб'яднанае пасяджэньне зьезду рабселькораў

**Сёньня, а 5 гадзіне ўвечары, у памяшканьні Дому Камасьветы, адбудзецца АБ'ЯДНАНАЕ ПЛЕНАРНАЕ ПАСЕДЖАНЬНЕ зьезду сумесна з Прэзыдыумам Дзяржпляну БССР, Бюро ЦК ЛКСМБ, Прэзыдыумам Бел. Акадэміі Навук, Прэзыдыумам Бел. МБІТ і Прэзыдыумам Сэкцыі Навуковых працаўнікоў.**

**а) Даклад старшыні Дзяржпляну БССР т. Гольдбэрга.**

**Пэрспэктывы разьвіцьця народнай гаспадаркі БССР на базе генэральнага пляну электрыфікацыі і задачы рабселькораў.**

**б) Выступленьне членаў ураду БССР, кіруючых работнікаў прамысловасьці, спэцыялістых і г. д.**

**в) Пасьля пасяджэньня мастацкая частка.**

**Уваход для членаў Прэзыдыуму Дзяржпляну БССР, Бюро ЦК ЛКСМБ, Прэзыдыуму БАН, Прэзыдыуму Бел. МБІТ і Прэзыдыуму сэкцыі навуковых працаўнікоў—па сваіх пасьведчаньнях.**

**ПРЭЗЫДЫУМ ЗЬЕЗДУ.**

Дэлегаты зьезду ў час перапынку.

Другі ўсебеларускі зьезд рабселькораў

## У адказ на артыкул ЦО УсеКП(б) „Правды"

Усебеларускі зьезд рабочых, калгасных і ваенных карэспандэнтаў, азнаёміўшыся з рэдакцыйным артыкулам Ц.О. нашай партыі «Правда», у якім адзначаецца правільная лінія з боку ЦК КП(б)Б, у якім адзначаецца правільнае бальшавіцкае кіраўніцтва з боку ЦК КП(б)Б партарганізацый і друку БССР рабселькоўскім рухам, таксама значныя дасягненьні ў справе перабудовы рабселькоўскага руху, што знайшло свой адбітак у падрыхтоўцы да зьезду і правільнай арганізацыі яго работы падкрэсьлівае, што тым посьпехі, якія адзначаюцца ў рэдакцыйным артыкуле «Правды», зьяўляюцца **ТОЛЬКІ ПАЧАТКАМ САПРАЎДЫ ПЕРАБУДОВЫ РАБСЕЛЬКОРАЎСКАГА РУХУ Ў БССР НА ПАДСТАВЕ ПАСТАНОВЫ ЦК УсеКП(б).**

Перад рабселькорамі БССР стаяць упераадзе задачы барацьбы за яшчэ большае разгортваньне, пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, сацыялістычнага будаўніцтва, кіруючыся дырэктывай нашай партыі і асабліва апошняй прамовай т. Сталіна аб новых задачах гаспадарчага будаўніцтва, у новай абстаноўцы. Абгаварэньнем у сэкцыях зьезду канкрэтных задач рабселькораў у асобных галінах прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, —мы атрымаем **НОВУЮ ЗАРАДКУ ЭНЭРГІІ, КАБ КОЖНАМУ НА СВАІМ ВУЧАСТКУ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТЫІ ЎЗМАЦНЯЦЬ ТЭМПЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА НАСТУПЛЕНЬНЯ, НАНЕСЬЦІ ЎДАРЫ ПА КЛЯСАВАМУ ВОРАГУ,—БЮРАКРАТУ, ПА КАЛЯПАРТЫЙНЫМ АБЫВАТАЛЯМ, АПАРТУНІЗМУ ЎСІХ АДЦЕНЬНЯЎ.**

**НЯХАЙ ЖЫВЕ ЦК УсеКП(б) І ЯГО БАЯВАЯ ЛЕНІНСКАЯ «ПРАВДА».**

## „Правду"- -умасы

### Пастанова бюро Менскага гарадзкога камітэту КП(б)Б па пытаньні пашырэньня ЦО „Правды"

**1. Улічваючы зусім дрэнную работу з боку Менскага газэтнага бюро і паслабленьне ўвагі з боку партыйна-камсамольскіх арганізацый па пашырэньні ЦО «Правда», што за апошні месяц тыраж на Менску зьнізіўся з 6.109 экз. да 4.798 у ліпені, а месячнае заданьне складае 9.200, што па сутнасьці зьяўляецца зрывам распаўсюджваньня ЦО «Правды».**

**2. Выходзячы з гэтага бюро гаркому пастанаўляе:**

**а) У мэтах узмацненьня працы па пашырэньні «Правды» і пасьпяховага выкананьня кантрольнай лічбы, абвясьціць на гораду 15-ці дзёньнік штурму —з 12 па 27 ліпеня, прапанаваць партыйным, камсамольскім, прафэсыянальным арганізацыям гораду, газэтнаму бюро гар. жылсаюзу і райкалгассаюзу разгарнуць у гэты час шырокую масавую кампанію па забесьпячэньні выкананьня і перавыкананьня кантрольных лічбаў на прадпрыемствах з тым, каб на жнівень месяц падпіска дасягнула па горадзе да 10 тыс. экз.**

**б) Усім ячэйкам і парткалектывам неадкладна вылучыць адказных таварышоў за правядзеньне 15-дзёньніка з членаў бюро, якім і даручыць апэрацыйнае кіраўніцтва па распаўсюджваньні «Правды» сярод мас, сыстэматычна асьвятляючы ход 15-дзёньніка ў насьценгазэтах і шматтыражках.**

**Апэрацыйнае кіраўніцтва па горадзе ўскласьці на сэктар друку гаркому.**

**в) Прапанаваць парткалектыву і ячэйкам пытаньне аб пашырэньні «Правды» з мэтай абмеркаваньня на ячэйкавых сходах з пункту погляду «НІВОДНАГА КАМУНІСТА, КАМСАМОЛЬЦА, ПЕРАДАВОГА РАБОЧАГА І КАЛГАСЬНІКА БЕЗ ГАЗЭТЫ «ПРАВДА».**

**г) Прапанаваць газэтн. бюро палепшыць і ўзманіць працу як па зборы падпіскі, так і па розьнічнай продажы газэты «Правда».**

**д) Фракцыі гарсавету правесьці шырокую кампанію ў час 15-дзёньніка сярод прафсаюзных арганізацый аб павялічэньні падпіскі і прасоўваньні сярод рабочых газэты «Правда».**

## Да ўсіх рабселькораў Беларусі, да ўсіх рэдкалегій фабрычна-заводзкіх і саўгасна-калгасных газэт

### Таварышы!

**У Беларусі цэнтральны орган нашае партыі «ПРАВДА» распаўсюджваецца вельмі нездавальняючымі тэмпамі. Зьезд лічыць, што ўсе рабселькоры і нізавы друк павінен прыйсьці на дапамогу партыі ў справе прасоўваньня Ц. О. у массы як адаго з галоўнейшых ўмоў узмацненьня партыйнага кіраўніцтва.**

**Дэлегаты 2-га Ўсебеларускага зьезду рабселькораў Савецкай Беларусі аб'яўляюць сябе ўдарнікамі «ПРАВДЫ» і мабілізуюцца на правядзеньне штурма прарыва прасоўваньня цэнтральнага органа партыі ў масы рабочых і калгасьнікаў.**

**Мы бярэм на сябе абавязак калі вернемся на месца разгарнуць масавую работу па прасоўваньні «ПРАВДЫ» як на старонках друку, так і шляхам арганізацыйнай працы сярод рабочых і калгасьнікаў з тым

# Даць пісьменнае папаўненьне Чырвонай арміі

## Да ўсіх асьветнікаў, камсамольцаў, членаў т-ва „Прэч няпісьменасьць“ і Асоавіахэму, да ўсіх працоўных БССР

Посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР выклікаюць шалёную нянавісьць капіталістычнага сьвету і падрыхтоўку імпэрыялістаў да інтэрвэнцыі.

Краіна перамагаючага сацыялізму—СССР як ніколі стаіць перад пагрозай узброенага нападу імпэрыялістычных драпежнікаў, якія імкнуцца сарваць сацыялістычнае будаўніцтва. Наша непераможная Чырвоная армія павінна як ніколі пільна стаяць на варце сацыялістычнай бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту.

Восьмую гэтага году ў Чырвоную армію ўліваецца чарговы прызыў рабочай, калгаснай, сялянскай, працоўнай моладзі нараджэньня 1909 году. Ва ўмовах шалёнай падрыхтоўкі імпэрыялістаў да ўзброенага нападу на СССР мы павінны забясьпечыць усе магчымасьці для таго, каб прызыўнік 3-га рашаючага году пяцігодкі быў пісьменным і палітычна падрыхтаваным, каб ён мог у кароткі час поўнасьцю аўладаць баявой тэхнікай, тэхнікай абароны сацыялістычнага будаўніцтва.

### Дамо Чырвонай Арміі пісьменных байцоў

Чырвона-штандарныя асьветнікі! Вы павінны ў першую чаргу рашуча ўзяцца за ліквідацыю няпісьменнасьці і малапісьменнасьці сярод прызыўнікоў. Кожны асьветнік, кожны культармеец павінен падхапіць заклік ЦП Саюзу Працасьветы—«Дамо пісьменнага прызыўніка Чырвонай арміі дапаможам арміі у далейшым заняцца сваёй непасрэднай задачай—вайсковай падрыхтоўкай байца, пасьпяхова аўладаць баявой тэхнікай». Асьветнікі павінны дабіцца 100 проц. ахопу лікпунктамі прызыўнікоў, усе профзьвенні Саюзу Працасьветы павінны ўключыцца ў гэтую пачэсную работу, вылучыць асьветнікаў, мэтадыстых, арганізатараў культармейцаў. Мабілізаваць на справу барацьбы за пагалоўны пісьменны прызыў 1.500 асьветнікаў. Раённыя і гарадзкія праўленьні Саюзу Працасьветы павінны дапамагчы вылучаным культармейцам арганізаваць справу ліквідацыі няпісьменнасьці, стварыць такія ўмовы працы, якія-б забясьпечылі пасьпяховае выкананьне пастановы партыі і ўраду—даць пісьменны прызыў Чырвонай арміі.

Пастаўленыя задачы могуць быць выкананы пры актыўным удзеле ў гэтай справе ўсёй асьветніцкай масы і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці мэтадамі культэстафэты, пры разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва. На вырашэньне гэтых задач ЦП Саюзу Працасьветы заклікае чырвона-штандарных асьветнікаў і ўсіх працоўных.

Саветы, ячэйкі і ўсе члены Т-ва «Прэч Няпісьменнасьць»! Паставім справу ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці сярод прызыўнікоў на ўдарныя баявыя рэйкі працы.

Саветы Т-ва «ПН»—безадкладна правяртэ гэту справу ў раёне. Возьмуцца на строгі вучот і грамадзкі кантроль пэрсанальна кожнага няпісьменнага і малапісьменнага прызыўніка, правяртэ кожнага з іх ці ліквідуе ён сваю няпісьменнасьць, прымацуйце да кожнага няпісьменнага прызыўніка культармейца-ударніка, члена Т-ва «ПН» і ўскладзеце на яго адказнасьць за ліквідацыю няпісьменнасьці прыкаванага прызыўніка. Абавяжэце кожную ячэйку вылучыць актывіста члена Т-ва «ПН» адказнага за гэту справу.

Па бальшавіцку выканаем гэту задачу. Разгорнем ва ўсіх зьвеньнях Т-ва выхаваўчую працу з прызыўнікам.

### Арганізацыя Асоавіахэму

Памятайце сваё самаабавязацельства—вылучце ў кожным раёне, ня менш 5 культармейцаў з шэрагаў Т-ва для ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці сярод прызыўнікоў. Дапаможам Т-ву «ПН» і асьветнікам, органам нарасьветы ў арганізацыі і поўнай ліквідацыі няпісьменнасьці сярод прызыўнікоў. Наладжвайце палітычна-выхаваўчую працу на л.-п, азнаёмце ўсіх ліквідуючых сваю няпісьменнасьць з гісторыяй і задачай Чырвонай арміі. Возьмеце пад пільны нагляд усіх няпісьменных прызыўнікоў, дапамажэце ім зьнішчыць спадчыну царскага ладу—няпісьменнасьць. Падрыхтуйце іх для пасьпяховай падрыхтоўкі ў шэрагах Чырвонай арміі.

### Камсамольцы і працоўная моладзь

Прызыў 3-га рашаючага году пяцігодкі павінен як ніколі быць пісьменны і палітычна падрыхтаваны, уліцца ў шэрагі РСЧА. Ліквідацыя няпісьменнасьці сярод прызыўнікоў мае выключна важнае палітычнае значэньне. На гэту справу павінна мабілізавацца ўся камсамольская арганізацыя.

Арганізацыі ЛКСМБ павінны неадкладна ўключыцца і па баявому правесьці ўсебеларускі паход за клясавапісьменны прызыў моладзі 3-га рашаючага году пяцігодкі. РК, ГК і ячэйкі павінны неадкладна мабілізаваць усіх камсамольцаў, студэнтаў і рабочую, калгасную працоўную моладзь для ліквідацыі няпісьменнасьці, палітычнай, тэхнічнай і агульна-адукацыйнай сярод прызыўнікоў.

**Саветы ваяўнічых бязбожнікаў.** Вы павінны неадкладна даць заданьне ўсім ячэйкам СВБ на прадпрыемствах, саўгасах, калгасах, пабудовах, дапамагчы вызяць на вучот усіх няпісьменных прызыўнікоў, ліквідаваць сярод іх няпісьменнасьць і правесьці сярод іх шэраг гутарак а клясавай сутнасьці рэлігіі. Распаўсюдзіць сярод іх антырэлігійную літаратуру і ўцягнуць прыпрызыўнікоў у шэрагі ваяўнічых бязбожнікаў.

**Члены СВБ!** Па бальшавіцку выканаем гэту задачу. Усе на барацьбу за прызыўніка пісьменнага, за прызыўніка Бязбожніка.

**Краіна будуючагася сацыялізму павінна сьцерці з свайго твару пляму няпісьменнасьці і малапісьменнасьці, і ў першую чаргу, з тых, хто праз кароткі час павінен будзе ўліцца ў шэрагі Чырвонай арміі і аўладаць баявой тэхнікай.**

**За пісьменнага прызыўніка!**

**Выпрабаванымі мэтадамі соцспаборніцтва і ўдарніцтва забясьпечым клясава-пісьменны і сьвядомы прызыў 3-га рашаючага году пяцігодкі.**

Нарком Асьветы БССР **Платун**,
ЦП Працасьветы **Плятнёў**, ЦК ЛКСМБ **Рубінчык**, ЦС Т-ва «ПН» **Хмялеўскі**, ЦС Асоавіахэму **Дрылёнак**, ЦС СВБ БССР **Даўгаполаў**.

# „Новыя ўмовы прамысловасьці— патрабуюць работы па новаму“ (Сталін)

«Давайце бальшавіцкай самакрытыкай намацаем і выкрыем хваробы і хібы нашых прадпрыемстваў. Давайце абмяркуем усім пралетарскім калектывам, як ужываць указаньні тав. Сталіна ў кожнай галіне народнай гаспадаркі і ў кожным паасобным прадпрыемстве, цэху, брыгадзе». (З ліста Ленінградзкіх рабочых заводу імя Сталіна).

У цэнтральным органе «Правда» ад 11-га ліпеня надрукаваны адкрыты ліст рабочых, інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу і гаспадарнікаў Ленінградзкага мэталюргічнага заводу імя Сталі на да ўсіх рабочых заводаў і фабрык Савецкага Саюзу.

У сваім лісьце сталінцы пішуць: «Наш завод адназгодна адобрыў указаньні тав. Сталіна і прыступіў да канкрэтызацыі гэтых указаньняў прыстасавальна да нашых абставін. Паводле пастановы заводзкай партканфэрэнцыі, вылучылі брыгады, якія пад кіраўніцтвам вопытных інжынэраў, майстраў і кваліфікаваных рабочых кожная па паасобным пытаньні абгаворвалі, як трэба працаваць па-новаму.

Мы выканалі пяцігодку ў 2¾ гады. Мы дасягнулі ўзроўню пяцігодкі, затраціўшы на капітальнае будаўніцтва 5,5 млн. руб. замест 19,4 млн. руб. намечаных пяцігадовым плянам.

Гэтымі днямі мы ўпяршыню ў гісторыі нашай краіны выпусьцілі паравую турбіну, магутнасьцю ў 50 тыс. клв. У нашых цэхах узмацняецца незалежнасьць нашага Саюзу і падводзіцца моцны фундамант пад электрыфікацыю краіны.

Давайце бальшавіцкай самакрытыкай намацаем і выкрыем хваробы і хібы нашых прадпрыемстваў. Давайце абмяркуем усім пралетарскім калектывам, як ужываць указаньні тав. Сталіна ў кожнай галіне народнае гаспадаркі і ў кожным паасобным прадпрыемстве, цэху, брыгадзе.

Па-бальшавіцку правядзем у жыцьцё важнейшыя мерапрыемствы, паказаныя ў прамове тав. Сталіна і памножым нашы бліскуючыя перамогі на ўсіх франтох сацыялістычнай будоўлі.

На нашым заводзе бесьперапынку таксама пераварылі ў абязьлічку. Паломкі варштатаў, бясконцыя рамонты былі ў нас штодзённым зьявішчам. Гэтага больш цярпець немагчыма ніводнага дня. Завод распрацоўвае цяпер для струмантальнага аддзяленьня 2-зьменную сыстэму. Вопыт неадкладна перанясем на ўсё абязьлічанае абсталяваньне.

Абязьлічку абсталяваньня мы ліквідуем. А вось майстра да гэтага часу абязьлічаны. У майстра няма ўлады ў цэху. Плянаваньне і разьмеркаваньне дэталяй па цэхах адбываецца фактычна бяз майстра.

Тарыфна-расцэначнае бюро ўстанаўляе расцэнкі таксама бяз майстра, ня лічачыся з яго думкай. У вас на заводах відаць ня лепш. Давайце па-пралетарску ліквідуем небясьпечную абязьлічку майстра. Рашуча ўзмоцнім яго ўплыў над плянавым і разьмеркавальным аддзеламі. Распрацуем спэцыяльнае палажэньне аб правох і абавязках майстра на падставе гасразьліку і ўзмацненьня адзіначальля. Завод таксама пашырыць правы майстра ў галіне расцэнак. Таварышы, раскажэце аб сваім вопыце як можна лягчэй разьвязаць гэтае пытаньне, ад якога ў многіх выпадках залежыць выкананьне вытворчых плянаў.

У сувязі з прамоваю тав. Сталіна з яго заклікам стварацьвытворча-тэхнічную інтэлігенцыю рабочае клясы, мы абвяшчаем у жніўні новы набор у ВТНУ на 600 рабочых усіх кваліфікацый. Гэты праваны шлях па нашай думцы адкрыты для ўсіх заводаў нашага Саюзу.

Калі мы пасьля прамовы тав. Сталіна шчыльна падыйшлі да пытаньняў зарплаты, мы пераканаліся наколькі меў рацыю тав. Сталін, які сьцьвярджаў, што трэба разьбіць старую тарыфную сыстэму. Толькі дробна-буржуазная, «лявацкая» ўраўніляўка магла парадзіць такія факты, што чорнарабочы ў кузьні атрымліваў столькі-ж, колькі атрымлівае рабочы 4 разраду.

Такая сыстэма аплаты працы не магла дапамагаць росту зацікаўленасьці рабочага ў падвышэньні сваёй кваліфікацыі. Пры такой сыстэме не матло быць дастаковага росту прадукцыйнасьці працы, такая сыстэма падтрымлівала цякучасьць. І калі мы ўсё-ж перавыканалі свой плян, дык пры правільнай тарыфнай палітыцы мы маглі-б падвоіць тэмпы, з'эканоміць рабочую сілу і рэзка перавыкананць плян вынішэньня сабекошту і накапленьня сродкаў для індустрыялізацыі краіны.

Тав. Сталін гаворыць, што шлях да накапленьня сродкаў—укараненьне і ўмацаваньне гасразьліку. Што-ж наш завод зрабіў у гэтай галіне? У другім квартале мы перавялі на гасразьлік 7 цэхаў. Перавод на гасразьлік даў безадкладна буйныя вынікі. Ліцейная зьні зіла сабекошт з 8,2 проц. паводле плану да 12,6 проц., кузьня адпаведна — з 8,4 проц., да 9,35, мядзяналіцейная зьнізіла сабекошт на 4,7 проц. больш заданьня.

Гасразьліковыя брыгады нанесьлі сьмяротны ўдар браку.

Мы прыступаем да перазаключэньня дагавораў гасразьліковых брыгад і цэхаў. Уводзім прэміяльную сыстэму за лепшае правядзеньне гасразьліку. Мы будзем спаборнічаць паміж сабой, вы ходзячы з сваіх абавязацельстваў па гасразьліку. Мы прывядзем у рух пралетарскую сьмякалку, мабілізуем нашу рэвалюцыйную волю, укаранім гасразьлік ва ўсе поры нашага заводу.

Мы будзем на чале з нашымі камуністамі змагацца за перабудову па-новаму таксама, як мы ў свой час змагаліся супроць апартуністычных тэмпаў у турбабудаўніцтве.

Давайце-ж хутчэй перабудоўвацца, таварышы! Бліжэйшая праверка—выкананьне і перавыкананьне пляну трэцяга рашаючага кварталу.

Рэвалюцыйнымі тэмпамі — наперад, да новых перамог».

* * *

Заклік сталінцаў павінен быць неадкладна падхоплены і абгавораны сярод шырокай рабочай масы інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу і гаспадарнікаў на ўсіх прдпрыемствах БССР.

# Варашылаўцы ажыцяўляюць заклік правадыра

Прамова тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў сустрэла магутны водгук сярод рабочых машына-будаўнічага за воду імя Варашылава.

Для практычнага правядзеньня ў жыцьцё дырэктыў тав. Сталіна вылучана 20 чалавек з актыву (парт., праф. і ЛКСМ) на адзін месяц для праверкі перабудовы работы нізавых зьвеньняў і для дапамогі ім у гэтай перабудове. Пад кіраўніцтвам калектыву зараз прыступлена на брыгадах да праработкі прамовы правадыра. Гэтая праработка будзе праводзіцца на працягу 5 дзён падрад з тым, каб добра азнаёміўшыся, вывучыўшы гэтую прамову, ўзяцца за непасрэднае ажыцьцяўленьне дадзеных дырэктыў.

Практычна ўжо праводзіцца работа па самазамацаваньні рабочых за заводам да канца пяцігодкі. Акрамя таго, для падрыхтоўкі кадраў праводзіцца рад мерапрыемстваў. Па цэхох мяркуецца арганізаваць перакваліфікацыю некаторых рабочых. Але тут сустракаецца адна перашкода. Белмэталяабяднаньне забірае ўсе сродкі на тэхнічную вучобу ад заводу і канцэнтрує іх у сябе. Гэткім чынам яно мяркуе ў канцэнтраваным парадку падрыхтоўваць патрэбную колькасьць кваліфікаванай рабсілы. Трыкутнік заводу з гэтым зусім ня згодзен, бо яно зьнімае ўсялякую адказнасьць з заводу за падрыхтоўку кадраў, гэта стварае свайго роду «абязьлічку».

Што да непасрэдна тэхнічнай вучобы, то гурткоў па паасобных кваліфікацыях існуе даволі, але вельмі малы ахоп імі рабочых. У гэтым яшчэ вінаваты недахват вучэбных прылад. Восьчаму фабзаўком вылучыў 800 руб. для закупкі патрэбных кніг і інш. Да гэтага трэба дадаць, што прафсаюз працасьветы ня даў патрэбных кіраўнікоў для гурткоў, што таксама выклікае затрыманьне тэхвучобы.

Для палепшаньня жыльлёвых умоў рабочых ударнікаў зараз будуецца дом на 100 кватэр. Гэтыя кватэры будуць разьмеркаваны сярод замацаваўшых сябе на заводзе да канца пяцігодкі. Трыкутнікі цэхаў праверяць па сваіх цэхах кватэрнае становішча ўсіх рабочых. Для таго, каб будаўніцтва дому было пасьпяховае, вылучаецца рабочы ўдарнік, які будзе непасрэдна кіраваць гэтым будаўніцтвам. Неабходна толькі, каб гэтая пабудова была занесена ў лік ударных пабудоў, чым павінны зацікавіцца адпаведныя арганізацыі.

Для таго, каб палепшыць культурна-бытавыя ўмовы рабочых, адзін раз у пяцідзёнку будуць наладжвацца канцэрты на заводзе. Разам з гэтымі канцэртамі будуць праводзіцца гутаркі штодня для выхадных рабочых і іх утрыманцаў. Акрамя таго, будуць арганізоўвацца калектыўныя паходы ў кіно, музэі і інш.

Пры заводзе адчыняецца шавецкая майстэрня і цырульня, што таксама палепшыць бытавое абслугоўваньне рабочых.

З 14-га ліпеня на заводзе імя Варашылава абвяшчаецца пяцідзёньнік праверкі работы і перабудовы ЗРК. Асноўныя пытаньні праверкі—наступныя: 1) стан снабжэньня сталоўк і буфэту; 2) стан падрыхтоўкі ЗРК у галіне забесьпячэньня рабочых дрывамі, гароднінай, падрыхтоўка тары для гароднины, склады і г. д. 3) стан абароту ЗРК, абслугоўваньне пайнікаў, дагаворы, гаспадарчы разьлік і інш.

Акрамя таго, прапанавана ЗРК на працягу 5 дзён адчыніць па астатніх двух цэхох буфэты, апроч існуючага буфэту ў адным цэху.

Не пазьней 15-га жніўня ўсе работы на заводзе будуць пераведзены на зьдзелышчыну, якой будуць ахоплены 90 проц. рабочых.

У галіне зарплаты праароблена многа работы. Праведзены вопыт увядзеньня прагрэсыўна-прэміяльнай сыстэмы сябе апраўдаў. Яна дала добрыя вынікі. На гэтай аснове ёсьць пастанова партколектыву, каб зараз перавесьці ўсе асноўныя брыгады на гэтую сыстэму.

Распрацаваны спэцыяльныя мерапрыемствы аб асоба-вядучых прафэсіях. Трыкутнікам цэхаў прапанавана праверыць работу камун з пункту гледжаньня зьнішчэньня ўраўніляўкі. Тэрмін для гэтага даны дзесяцідзённы.

На гаспадарчы разьлік усе цэхі пераведзены яшчэ з 1-га красавіка. Гэта дало добрыя вынікі. **Мэханічны цэх** даў эканомію ў 26.000 рублёў у сыравіне. У гэтым цэху атрымана таксама эканомія ў рабсіле. **Ліцейны цэх** даў эканомію ў 6.000 руб.. Таксама ёсьць добры эфэкт і ў кацельным цэху, але дастатковых вынікаў у ім яшчэ няма. Асноўныя брыгады пераходзяць на гаспадарчы разьлік з 15-га ліпеня.

У галіне зьнішчэньня абязьлічкі таксама шмат зроблена. **Такарны цэх** на працягу 8 месяцаў працуе на 4-дзёнцы. Да кожнага варштата прымацавана 4 чал. У кожнай зьмене—а гэтыя зьмены сталыя,—ёсьць самастойныя цэх'ячэйкі КП(б)Б, ЛКСМ, майстра, 2 інструктары і гаспадарчы кіраўнік. Усе з аднэй зьмены—выхадныя ў адзін і той-жа дзень.

Таксама зьнішчана абязьлічка ў адносінах да струмантаў. У цэхох **кацельным, сьлясарным і ліцейным** існуюць кніжкі на струманты ў кожнага рабочага.

Для палепшаньня падрыхтоўкі прафінпляну на 4-ты квартал узмацняюцца апэрацыйна-плянавыя групы з дабраахвотнікаў рабочых і г. д.

Усе гэтыя факты сьведчаць, аб тым, што на заводзе імя Варашылава сапраўды ўзяліся за перабудову работы па-новаму, на аснове дырэктыў, да ных правадыром працоўных—тав. Сталіным.

Л. Пал.

# „Чырвоны Мэталіст“ ня выходзіць з паласы прарываў

## Прамова т. Сталіна на заводзе не прапрацавана

(*Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта*)

За першую пяцідзёнку ліпеня месяца завод «Чырвоны Мэталіст» паказаў наступныя даныя аб ходзе выкананьня прамфінпляну:

**Бульбакапалак сабрана 50 з 88 прадугледжаных па пляне.**

Трэба адзначыць, што, як і ў чэрвені месяцы, бульбакапалак сабрана толькі на 75 проц. Машыны скапляюцца на складах і ня могуць быць выпушчаны на рынак з-за адсутнасьці камплектаў шэсьцярэнак.

Кораньрэзак за тую-ж пяцідзёнку выпушчана 75 замест 128, што складае 66,40 проц. пляну.

У апошні дзень першай дэкады ліпеня выпушчана 7 бульбакапалак замест дзеннага пляну ў 22. Кораньрэзак выпушчана 10 шт. або 29 проц. да пляну.

**6 і 7 ліпеня бульбакапалак выпушчана ўсяго 3. У кораньрэзках выкананьне пляну даведзена да 76 проц. і 84 проц.**

Кідаецца ў вочы рэзкае хістаньне ў лічбах выкананьня пляну. Гэта тлумачыцца тым, што не наладжана вытворчасьць усіх дэталяй у такіх суадносінах, каб штодня забясьпечыць выкананьне праграмы вытворчасьці.

У цэхах робіцца так, што аднэй дэталі вырабляецца ліпшак на некалькі дзён, у другой дэталі наадварот адчуваецца недахват.

Ня гледзячы на пералом, які пачаўся ў партыйна-прафэсыянальных арганізацыях, якія павярнуліся тварам да вытворчасьці—ў выкананьні пляну пералому яшчэ няма. 23 бульбакапалак у дзень завод не дае.

Завод «Энгельса» ў Хорціцах пасьля сваёй першай нядбайнасьці 24 чэрвеня, калі ён прыслаў неўкамплектаваныя дэталі для бульбакапалак у непрапарцыянальнай колькасьці, цяпер зрабіў другую. З 3.000 камплектаў шасьцярэнак ніводная непрыгодна. Усе хварэюць схаваным бракам. Чыгун не перайшоў у стадыю коўкасьці. Пры першым лёгкім удары шасьцярэнка лопаецца, выяўляючы ў разрэзе палому перагарэлы чыгун. Дыямэтр шасьцярэнкі на 3 мм меншы мадэлі, а таму пры ходзе зубы не зачапляюцца, машына трохі папрацуе, а потым выбывае са строю.

Віна заводу «Чырвоны Мэталіст» у тым, што ён не пасылаў сваіх мадэляй, а сьлепа верыў дакладнасьці мадэляй разанскага заводу, які паслаў іх такса ма на завод «Энгельса».

З-за гэтай нераспараджальнасьці і адсутнасьці гібкай апэрацыйнасьці—завод «Чырвоны Мэталіст» ня можа даць рынку чэрвенскай праграмы ў 400 з лішкам бульбакапалак і ня можа закончыць чэрвеньскай прадукцыі. Заводакіраўніцтва ўсё звальвае на завод «Энгельса».

Гэтымі днямі вырашана замяніць часова нехапаючыя дэталі з коўкага чыгуну—бронзавым мэталем. Гэта можа зрабіць Віцебскі завод імя Камінтэрну, які знаходзіцца па суседзтву з «Чырвоным Мэталістам». Зроблен заказ на 350 камплектаў, але тэмп работы не забясьпечвае своячасовага атрыманьня заказу. Завод імя «Камінтэрну» мае ўсе вытворчыя даныя і патрэбную рабочую сілу для выкананьня заказу, хоць і з вялікай напружанасьцю. Неабходна заказ павялічыць да 550 камплектаў—лічбы месячнага пляну, і такім чынам забясьпечыць завод «Чырвоны Мэталіст» гэтым мэталем.

Рабочая грамадзкасьць «Чырвонага Мэталіста» павінна мабілізаваць усе сродкі для ўстанаўленьня шчыльнай сувязі з заводам «Камінтэрн».

Бульбакапалкі заводу «Чырвоны мэталіст» пасылаюцца на выпрабаваньне ў Маскву ў ВІСХОМ (Усесаюзны дасьледчы інстытут с.-г. машын). Мы лічым неабходным выпрабаваньне правесьці ў беларускіх умовах, на нашых глебах, тым больш, што машына патрабуе конскай цягі.

Заслугоўвае ўвагі прапанова інжынэра т. Хаджавіча аб зьняцьці роліка ў да падшыпнікаў колаў, ВІСХОМ павінен гэтым заняцца.

Хутка сэзон работы машын і, калі завод ня выйдзе са стадыі дасьледваньняў, выпрабаваньняў машын і сьвіс стапляскі заказаў па ліцьцё, пасле застанецца без машын.

**Вось цяпер на складах ляжаць тысячы асыпнікаў, маса плугоў, заграмаджаючы месца, а Белсельгасснаб і Саюзімпарт не забірае ніводнага плуга і асыпніка. Ідзе перапіска, а жывой справы няма.**

Трэба кінуць усе сілы на ліквідацыю ўсіх створаўшыхся прарываў.

Брыгады ўдарнікаў ня ведаюць яшчэ аб новых абставінах, новых задачах у сувязі з выступленьнем тав. Сталіна. Ціха ў гэтым сэнсе на заводзе.

Хто пачне штурм, таварышы ўдарнікі, заводу «Чырвоны Мэталіст»?

Гарын.

# Увага трэцяму пакаленьню

## Падрыхтоўка да ўсебеларускага зьлёту піянэраў павінна прайсьці пад кутом крутога павароту ўвагі ўсёй савецкай грамадзкасьці да піянэрскіх арганізацый

## Піянэры ў барацьбе за калектывізацыю

Падрыхтоўка да раённага піянэрзьлёту па Рэчыцкім раёне праходзіла пад знакам падагульненьня прароблена піянэрарганізацыяй работы ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва. Гэтае падагульненьне выявіла, што працоўныя дзеці таксама не заставаліся ў баку ад выкананьня гаспадарча-палітычных задач і практычна дапамагалі сваім бацьком і братом у ажыцьцяўленьні гэтых задач.

Так, піянэрарганізацыі раёну прымалі актыўны ўдзел у правядзеньні весна вой сяўбы. У выніку гэтага ў калгасах і саўгасах працавала 1.795 піянэраў, сіламі якіх у сацэкстары было засеяна 15 га гародніх і тэхнічных культур, пасаджана 1.215 новых і агледжана 980 старых садовых дрэў, сабрана 2.315 пудоў попелу, ачышчана і пратручана 983 пуды насеньня, сабрана 7.500 пудоў утыльсыравіны.

Піянэрарганізацыя ўзяла шэфства над жывёлагадоўляй раёну, змагалася і змагаецца за правільнае кармленьне апошняй, за палепшаньне пароды і г.д.

На лініі культмасавай і інтэрнацыянальнай работы піянэрамі распаўсюджана на 500 руб. літаратуры, аказвалася дапамога ў наладжваньні работы насьценгазэт, культмасавых вечароў. Сіламі піянэраў ліквідавана няпісьменнасьць сярод 250 чалавек, наладжана сувязь з замежнымі піянэрамі і палітзьняволенымі, якім аказвалася дапамога шляхам зьбіраньня грошай. Для дапамогі пацярпеўшым ад землятрасеньня піянэратрадамі раёну сабрана 465 руб. Рэалізавана білетаў ОЗЭТ лётарэі на суму 475 руб. Арганізавана 25 ячэек МОПР'у, у якія ўваходзяць 1.500 піянэраў.

Сіламі піянэраў рэалізаваны білеты АСО на суму 230 руб. Арганізаваны гурткі «юных прыхільнікаў ваенізацыі», якімі ахоплена 1.000 чалавек.

Падрыхтоўка да раённага зьлёту піянэраў, які пачнецца 10 чэрвеня г. г. у асноўным скончана. Распрацаваны парадак дню зьлёту, плян правядзеньня яго, падрыхтоўваюцца плякаты, лёзунгі. Створан раённы штаб і вылучаны адказныя таварышы за падрыхтоўку і правядзеньне зьлёту.

Становішча раённай піянэрарганізацыі напярэдадні зьлёту наступнае:

Усіх атрадаў у раёне 60, з якіх вясковых—35, гарадзкіх—25. Ва ўсіх атрадах налічваецца 2.400 піянэраў. Піянэры ў горадзе разьбіты па базах, усіх баз 5. Баз прымацаваны да вытворчасьці. Маюцца 2 калгасныя базы.

Райштаб.

## Рыхтуемся да райзьлёту

Падрыхтоўка да раённага зьлёту ў Клічаўскім раёне пачалася з 10 чэрвеня. Для правядзеньня лепшай падрыхтоўкі з раёну былі высланы брыгады ў вясковыя атрады з мэтай растлумачэньня задач піянэрзьлёту. Атрады заключылі паміж сабою сацспаборніцтва. У сац. умовах унесены пункты аб уцягненьні ў час падрыхтоўкі да зьлёту 100 проц. неарганізаваных дзяцей працоўных раёну ў піянэрарганізацыі, а таксама аб прыняцьці актыўнага ўдзелу кожным піянэрам у рэалізацыі пазыкі «трэцяга рашаючага году пяцігодкі».

П. Б.

## Дагавор у дзейнасьці

Дагавары ЦБ ДКО з НКЗ і ВСНГБ—плян баявых дзеяньняў піянэрарганізацыі на ўдзеле ў выкананьні плянаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

У выніку 3-х месячнай работы, пасьля заключэньня гэтых дагавораў піянэрарганізацыя Асіпавіцкага раёну зрабіла наступнае:

**Па дагавору з НКЗ:**

Сіламі піянэраў у калгасы ўцягнута 12 сялянскіх сямей, адсартавана 1.500 пуд. насеньня, сабрана 1.840 пуд. попелу, распаўсюджана на 490 р. 4 кап. сельска-гаспадарчай літаратуры; зроблена 154 шпакоўніцы; закладзена 8 дасьледных гародаў; у 17 калгасах узята шэфства над с.-г. інвэнтаром; агледжана 17 калгасных садоў; сабрана 62 пуд. ануч, 43 пуд. касьцей.

**Па дагавору з ВСНГБ:**

Узята шэфства над дэпо, чатырма сталоўкамі, апалавым складам. Замацавана 67 рабочых да канца пяцігодкі на прадпрыемствах раёну; 78 чалавек уцягнуты ва ўдарныя брыгады, завербавана 41 чал. у касы ашчаднасьці; 59 піянэраў зьяўляюцца самі ўкладчыкамі ў ашчадкасы. Узята шэфства над чорнай і чырвонай дошкай у дэпо і 3-х калгасах. Вядзецца культпрацa ў дэпо, сталоўцы, 2-х калгасах, сабрана 68 пуд. мэталялому.

Піянэры дадаткова падпісаліся на 120 руб. пазыкі «Пяцігодка ў 4 гады».

Па Ўсебеларускай піянэрскай трывозе паслана ў вёску 9 брыгад. Пры 3-х піянэратрадах выходзяць насьцен газэты.

Піянэрамі выпісана 600 экз. газэты «Піянэр Беларусі», 82 экз. «Юнгер Ленінец», 160 экз. «Піянэрская Праўда», 72 экз. «Іскра Ільліча».

Б.

# У паласе прарываў

(*Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта*)

У чэрвені месяцы аб'яднаны пленум Бабруйскага РК і РКК КП(б)Б заслухаў даклад аб выніках веснавой сяўбы і калектывізацыі. У сваёй рэзалюцыі пленум запісаў: «пленум прызнае работу бюро РК, прэзыдыуму РКК і фракцыі РВК у галіне калектывізацыі **нездавальняючай**, што тлумачыцца наяўнасьцю апартуністычнага спадзяваньня на самацёк, слабым правядзеньнем масавай работы сярод беднаты з боку большасьці парт'ячэек, недастатковай барацьбой з кулацка-заможнай часткай, несвоячасовым ажыцьцяўленьнем дырэктыў ЦК і пленуму Райкому аб шчыльнай увязцы работы па калектывізацыі з астатнімі палітычна-гаспадарчымі кампаніямі».

Больш глыбокае вывучэньне становішча работы ў Бабруйскім раёне паказвае, што гэту ацэнку, дадзеную пленумам у галіне калектывізацыі, можна аднесьці і да цэлага ряду галін іншых работ, (выкананьне пасеўных плянаў, барацьба за выкананьне прамфінпляну, мабілізацыі сродкаў ды інш.).

Бабруйск — гэта былы акруговы цэнтр, у ім засталася працаваць значная частка былых акруговых працаўнікоў. Бабруйск мае вялікую і моцную партыйную і камсамольскую арганізацыю са значным пластыкам. У Бабруйску ёсьць вялікая колькасьць рабочых (каля 12.000). Усё гэта стварае найлепшыя ўмовы для поўнага выкананьня дырэктыў партыі, якія былі пастаўлены перад Бабруйскай парт-арганізацыяй ў часе веснавой сяўбы. Але, ня гледзячы на гэта, Бабруйскі раён мае буйнейшыя прарывы ва ўсіх галінах работы.

Дырэктыва партыі ў галіне калектывізацыі і пастанова пленуму Бабруйскага РК КП(б) аб тым, каб у веснавую сяўбу калектывізаваць ня менш 30-35 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак раёну, аказалася далёка ня выкананай. На сёньняшні дзень Бабруйскі раён цягнецца ў хвосьце амаль усіх раёнаў БССР.

Уступіўшы ў веснавую сяўбу з 12 проц. калектывізацыі Бабруйскі раён не дамогся належных посьпехаў і ў часе сяўбы. Процант калектывізацыі ў момант скончэньня сяўбы дасягнуў толькі 15, а 8 ліпеня ён складаў 17 проц.

Веснавую сяўбу Бабруйскі раён скончыў таксама з глыбоким прарывам. Плян пашырэньня пасеўнай плошчы недавыкананы на 12 проц. Раён мае садова-гародны напрамак і гэта павінна было знайсьці сваё ажыцьцяўленьне ў часе веснавой сяўбы. На справе мы маем паўнейшы правал пляну пасеву гародаў і пасадкі садоў, плян выкананы менш, чымся на 50 проц. Значнае недавыкананьне пляну ёсьць таксама і па пасеве бульбы (1.393 га замест 1.963), кораньплодаў, махоркі і асабліва правалены плян па сіласных культурах—замест 344 га пасеяна толькі 98 га.

Дзе-ж прычыны, у чым карэньні тых буйнейшых правалаў, якія ёсьць у Бабруйскім раёне? Гэтыя прычыны частка захаваны ў падаванай вышэй вытрымцы з рэзалюцыі пленуму, падкрэсьліваем, што **частка**й, але далёка ня поўнасьцю.

Асноўныя і галоўныя прычыны можна знайсьці ў самім кіраўніцтве Бабруйскай партарганізацыі, якое ня здолела па-бальшавіцку мабілізаваць усю партарганізацыю, усіх рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў аднаасобнікаў на пасьпяховае выкананьне задач, якія былі пастаўлены партыяй перад усёй КП(б)Б і ў прыватнасьці перад Бабруйскай арганізацыяй. Зьвернемся да фактаў:

Пачынаючы з лютага, месяца раённая газэта «Камуніст» сыстэматычна сігналізуе аб тым, што падрыхтоўка да сяўбы ў раёне зрываецца, што засыпка насенных і страхавых фондаў праходзіць вельмі павольнымі тэмпамі.

Трэба адзначыць, што раённая газ. «Камуніст» сыгналізуючы аб асобных прарывах, не заўсёды выкрывала іх канкрэтных носьбітаў і ня прымала належных мер, каб давесьці справу да канца. «Камуніст» не дабіваўся хуткага і рашучага рэагаваньня з боку РК КП(б)Б і РКК на зьмяшчаемыя ім матар'ялы. Такім чынам, доля віны за прарывы падае і на рэдакцыю газэты «Камуніст».

16-га сакавіка «Камуніст» піша, што «тэмпаў у справе калектывізацыі няма, падрыхтоўка да сяўбы ня ўвязана з узьняцьцем калгаснага руху і кантрактацыяй яравых, ёсьць самае яскравае праяўленьне права-апартуністычных настрояў як на мясцох, так і ў раённых кіруючых органах».

20 красавіка ў «Камунісьце» ў артыкуле пад загалоўкам «Да сяўбы не гатовы» чытаем наступнае:

«На мясцох назіраюцца моманты правага апартунізму на практыцы, што выяўляецца ў недаацэнцы калгаснага будаўніцтва, спадзяваньні на самацёк і недастатковай барацьбе з кулацтвам і нават дапушчэньням іх у калгасы (калгасы «Новае Жыцьцё», «Чырвоная Віктараўка» ды інш.).

«Камуніст» ставіць пытаньне аб тым, што «справа падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, справа калектывізацыі знаходзіцца ня ў поўных руках» «Камуніст» зусім правільна патрабуе перамены кіраўніцтва Райкалгассаюзу і Райземчасткі, якія відавочна правальвалі пад рыхтоўку да сяўбы, якія ня толькі не зьяўляліся штабам калектывізацыі, але зусім ня ведалі, што робіцца ў раёне, былі адарваны ад яго і ня мелі ніякіх зьвестак а

# ДА ПЕРШАГА ЖНІУНЯ

## поўнасьцю рэалізаваць пазыку на вёсцы

### Нанесьці рашучы ўдар па кулаку, які агітуе супроць пазыкі

### Да пачатку ўраджаю---рэалізаваць пазыку ў вёсцы

У барацьбе за хутчэйшы пуск «518» новых сацыялістычных гігантаў і «1040» машынатрактарных станцый, у барацьбе з усякімі праявамі правага і «леваго» апартунізму і прымірэнцтвам да іх, у барацьбе з кулаком у вёсцы і нэпманам у горадзе, рабочая кляса сумесна з усімі працоўнымі Савецкага Саюзу паказвае геройныя посьпехі ў справе рэалізацыі пазыкі «3-ці рашаючы».

Рэалізацыя пазыкі «3-га рашаючага году» па гарадох у БССР у асноўным падходзіць к канцу. На большасьці прадпрыемстваў і ўстаноў наяўная рабочая , служачыя ахоплены падпіскай, але гэта зусім не азначае таго, што справа з пазыкаю ўжо скончана. Работа па рэалізацыі пазыкі і надалей павінна праводзіцца тымі-ж непаслабляючымі тэмпамі, якімі яна праводзілася і да гэтага часу. Трэба, каб тыя рабочыя і служачыя, якія зараз прыбываюць і будуць прыбываць з адпачынку былі-б поўнасьцю ахоплены падпіскай.

Калі мы гаворым аб тым, што па гарадох БССР у асноўным падпіска падыходзіць к канцу, дык зараз-жа ні наводную хвіліну не паніжаючы тэмпаў, неабходна ўсю ўвагу пазыковай кампаніі накіраваць у вёску. Бо не ў якім разе «...нельга зьніжаць тэмпы. Наадварот,... іх трэба павялічваць... затрымаць тэмпы—гэта значыць адстаць». (Сталін).

Трэба неадкладна перанесьці лепшыя вопыты і прыклады па рэалізацыі пазыкі з заводаў і фабрык у вёску, на вопыту якіх шырэй разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж калгасамі, сельсаветамі і вёскамі. Шэфскім арганізацыям, камсодам сумесна з зямляцкімі групамі трэба скласьці канкрэтныя плыны па разьмяшчэньні пазыкі ў сваёй падшэфнай вёсцы, саўгасу, калгасу, МТС. У дні адпачынку неабходна накіраваць у падшэфныя калгасы рабочыя брыгады, трэба скарыстаць усе магчымасьці для посьпяховага правядзеньня пазыковай кампаніі ў вёсцы з тым разьлікам, каб 1-га жніўня падпіска сярод вясковага насельніцтва была поўнасьцю скончана.

Ні ў якім разе ня трэба спадзявацца на тое, што разьмяшчэньне пазыкі сярод вясковага насельніцтва пойдзе самацёкам, бяз усякай растлумачальнай работы. Такія адносіны да гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі будуць зьяўляцца ні чым іншым, як праявай апартунізму на практыцы. Трэба павесьці самую шырокую масавую работу сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў, растлумачыць шырокім калгасным, бядняцка-серадняцкім масам вёскі, што: «сутнасьць бальшавіцкага наступу состаіць,... у тым, каб мабілізаваць максімум сродкаў на справу фінансаваньня нашай індустрыі, на справу фінансаваньня нашых саўгасаў і калгасаў». (Сталін).

У тых мясцох, дзе добра праводзіцца растлумачальная работа, маюцца бліскучыя посьпехі ў рэалізацыі пазыкі. Напрыклад, Клімавіцкі, Хадопеніцкі раёны ўжо перавыканалі свае заданьні па падпісцы. Агульны сход калгасу «Другая бальшавіцкая вясна» пад пісаўся на пазыку «3-ці рашаючы» ў разьмеры месячнага прыбытку. Члены камуны «Араты», Расьнянскага раёну ў ліку 42 чалавек падпісаліся на пазыку на 1.260 працадзён і цэлы рад іншых калгасаў «Чырвоная Беларусь». Як відаць з кожным днём новая хваля энтузіязму ахапляе шырокія калгасныя масы БССР, узьнімаючы іх на сацспаборніцтва і ўдарніцтва па лепшым разьмяшчэньні пазыкі.

Але, ня гледзячы на гэтую вялікую актыўнасьць, якая на сёньняшні дзень маецца ў калгасьнікаў і аднаасобнікаў БССР, якія сваёй самаадданасьцю, на справе дапамагаюць партыі і ўладзе будаваць сацыялізм ў сваёй краіне, мы ў вёсцы сустрэнемся з клясавым ворагам—кулаком, які ўсімі сіламі і сродкамі аказвае шалёнае супраціўленьне, каб пашкодзіць пасьпяховаму правядзеньню пазыковай кампаніі ў вёсцы. Гэтым спробам клясавага ворага трэба даць рашучы адпор. Тут, сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў на вёсцы павесьціся самая шырокая палітычна—выхаваўчая работа. Гэту задачу ў першую чаргу павінны ўзяць на сябе рабочыя шэфы.

Трэба павесьці самую рашучую барацьбу з тымі апартуністычнымі скажэньнямі клясавай лініі, якія яшчэ дзе-ні-дзе наглядаюцца пры разьмяшчэньні пазыкі. Неабходна ачысьціць шлях ад правага апартунізму, павесьці рашучую барацьбу з «левымі» наскокамі, якія ёсьць у асобных мясцох.

У нас у БССР у асобных мясцох у горадзе былі праявы правага і «леваго» апартунізму пры разьмяшчэньні пазыкі. Напрыклад: у друкарні імя Сталіна (Менск) з самага пачатку пазыковай кампаніі панаваў апартуністычны самацёк, потым масавую работу імкнуліся падмяніць адміністрацыйна-прыказным. Гэтыя скажэньні атрымалі рашучы адпор з боку нашых партыйных органаў. Нашыя пазыкі зьяўляюцца добраахвотнымі. Такімі яны застаюцца быць у горадзе і ў вёсцы, усякім вылазкам правых апартуністаў, а таксама і «левым» наскокам з боку нашых партыйных органаў будзе супроцьпастаўлена чоткая клясавая лінія.

Было-б вялікай палітычнай памылкай заспакоіцца на дасягнутых посьпехах па рэалізацыі пазыкі і недаацаніць адной з важнейшых работ: замацаваньня і афармленьня падпіскі сярод падпісчыкаў. Мы зараз яшчэ цьвёрда ня можам сказаць, на колькі ў БССР замацавана і афармлена падпіска. Таму, перад усімі прафарганізацыямі, сельсаветамі, камсодамі, павінна стаць неадкладная, баявая задача—прыступіць да замацаваньня і афармленьня падпіскі.

Ударны месячнік, абвешчаны ў БССР ЦК КП(б)Б па рэалізацыі пазыкі на вёсцы, павінен быць сапраўдным ударным. Высунуты лёзунг калгаснікамі—ударнікамі аб поўнай рэалізацыі пазыкі да пачатку ўраджаю, гэта значыць да 1-га жніўня павінен быць выкананы.

Даючы рашучы адпор кулаку, бязьлітасна выкрываючы правых і «левых» апартуністаў, шырокай растлумачальнай работай, сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам, лепшымі сіламі савецкай грамадзкасьці поўнасьцю і ў тэрмін выканаем і перавыканаем заданьні па рэалізацыі пазыкі «3-га рашаючага» і гэтым самым забясьпечым фінансавань не сацыялістычнай будоўлі «3-га рашаючага году пяцігодкі».

### Мабілізуем сілы на рэалізацыю падпіскі ў вёсцы

**Рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь". Рапарт**

Для забесьпячэньня 100 проц. выкананьня кантрольных лічбаў падпіскі на прадпрыемствах гораду РМК зрабіў наступнае:

Мабілізавана ўся грамадзкасьць нашага саюзу па выяўленьні і дапамозе камсодаў гораду па падрыхтоўцы да новай пазыкі.

Мы вылучылі дакладчыкаў у колькасьці 42, а таксама МК Гарфа, Ашчадкас і Банку падрыхтавалі свае падшэфныя цэхі, як-то: завод «Пралетары», завод імя Ланцуцкага, і фабрыка «К. Цэткін».

Адбыўся зьлёт ударнікаў нашага саюзу, дзе абвесьцілі сябе мабілізаванымі да канца кампаніі, для правядзеньня растлумачальнай работы на прадпрыемствах, установах, калгасах, саўгасах і на вёсцы.

З 1-га ліпеня РМК пераключыўся на правядзеньне падпіскі па вёсцы. Мабілізавана 18 лепшых ударнікаў, з іх: 14 чал. ужо знаходзяцца на вёсцы.

На 6-га ліпеня заданьне па пазыцы выканана на 102 проц.

Старшыня Гомельскага РКМ Фінбанкаўскіх работнікаў.

**Лапін.**

### Вушацкі плян мабілізацыі сродкаў пад пагрозай зрыву

Плян мабілізацыі сродкаў 2 кварталу па Вушацкім раёне выкопвацца ўсяго на 50,8 проц. квартальнага заданьня.

Недапушчальным зьяўляецца той факт, што вельмі дрэнна ўносяцца гроші на пазыку «пяцігодка ў чатыры гады». Гэта тлумачыцца тым, што сельсаветы, і асабліва камісіі садзейнічань ня не праводзяць ніякай растлумачальнай работы сярод працоўнага насельніцтва раёну.

Мізэрным зьяўляецца процант выкананьня пляну па ўнясеньні грошай на акцыі Трактарацэнтру. Кіраўніцтва МТС, забылася, што для будаўніцтва МТС ў раёне патрэбны сродкі і што гэтыя сродкі павінны быць мабілізаваны тут-жа ў раёне.

**Вушацкі.**

### Калгасьнікі Сураскага раёну падпісваюцца на месячны заработак

Калгасьнікі Сураскага раёну, як сапраўды апорныя пункты на вёсцы, праяўляюць вялікую актыўнасьць у справе разьмяшчэньня пазыкі «трэцяга рашаючага».

Адбыўшаяся ў Суражы раённая канфэрэнцыя калгасьнікаў і калгасьніц, аднагалосна пастанавіла кожнаму калгасьніку і кожнай калгасьніцы падпісацца на пазыку ня менш 3-тыднёвага заработку, пераведзенага ў працаднёх.

Калгасьнікі пастанавілі павесьці сыстэматычную работу па ахопу падпіскай на пазыку сярод аднаасобнага сэктару бядняцка-серадняцкага сялянства.

На той-жа канфэрэнцыі, у мэтах найлепшага кіраўніцтва ходам кампаніі на вёсцы абраны пры Райкалгассаюзе штаб у склад якога ўвайшлі лепшыя актывісты калгасьнікі і калгасьніцы.

Калгасьнікі—ўдарнікі Сураскага раёну, на першым зьлёце калгасьнікаў—ударнікаў падпісаліся на месячны заработак пераведзенага ў працаднёх у суме 1385 руб. Зьлёт даў тэлеграму **сакратару ЦК КП(б)Б тав. Гею, старшыні ЦВК БССР Чэрвякову і Наркам фіну БССР тав. Хацкевічу.**

**Перальман.**

### Прарыў трэба ліквідаваць

Плян мабілізацыі сродкаў 2-га кварталу па Магілеўскім раёне выкананы толькі на 67,6 проц. Ня гледзячы на рад сыгналаў, Райспажыўсаюз збор паявых узносаў выканаў толькі на 18,6 проц., Дзяржбанк у галіне спагнаньня запазычанасьці сельгаспазык выканаў плян толькі на 26 процантаў. Райкалгассаюз і Райсадсаюз не разгарнулі работы па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру і абавязацельстваў на сельгасмашыны. Значная запазычанасьць да гэтага часу ёсьць па абавязковых плацяжох: па прыбытковых і прамысловых падатках—у горадзе і самаабкладаньні і аднаразовым зборы—у вёсцы. Асабліва вялікая запазычанасьць наглядаецца ў Цішоўскім, Шчэжарскім і В. Бялевіцкім сельсаветах.

Райашчадкаса не перабудавала свайго апарату, у выніку чаго апошняя дэкада дала адліў укладаў. Да гэтага часу ня выканана дырэктыва РВК аб пашырэньні сеткі ашчадкас у сельсаветах (маецца 6 кас на 29 сельсаветаў). У выніку гэтай работы, ашчадкаса па ўкладах выканала заданьне на 35,1 проц. Да гэтага часу не ліквідавана запазычанасьць па ўзносах за пазыку «Пяцігодка ў чатыры гады» (выканана на 54,3 проц.) Дзяржбанк і райашчадкаса ня прынялі дастатковых мер да ліквідацыі запазычанасьці па ўзносах і нават пры выяўленьні яўных злачынстваў у затрымцы і скарыстаньні адміністрацыйнай сабраных грошай не па прызначэньні—вінаватыя да адказнасьці ня былі прыцягнуты.

**У мэтах ліквідацыі маючыхся ў рабоце па мабілізацыі сродкаў прарываў і для забясьпечаньня поўнага выкананьня другога кварталу, прэзыдыум РВК абвясьціў з 20-га чэрвеня дэкаду штурму,** якая дала некаторае палепшаньне справы.

За праяўленую бязьдзейнасьць у мабілізацыі сродкаў, непрыняцьце належных мер да выкананьня заданьня другога кварталу, прэзыдыум РВК абвясьціў суровую вымову старшыні райспажыўсаюзу тав. Кашэну. Райспажыўсаюз па выкананьні другога кварталу быў занесены газэтай «Камунар Магілеўшчыны» на чорную дошку, але-ж на гэта ня была зьвернута ўвага і справа не палепшылася. Старшыня В. Бялевіцкага сельспажыўтаварыства за зрыў фінпляну другога кварталу зьняты з работы і прыцягнуты да судовай адказнасьці.

Старшыні райкалгассаюзу тав. Чарвякову за няпрыняцьце дастатковых мер да справы мабілізацыі сродкаў у калгасах па галіне распаўсюджваньня акцый Трактарацэнтру і абавязацельстваў на с.-г. машыны абвешчана суровая вымова.

За дрэнную работу ашчадкас, невыкананьне заданьня 2-га кварталу і неліквідаваньне запазычанасьці па пазыцы «Пяцігодка ў чатыры гады»—загадчык райашчадкасы тав. Арэшкін папярэджаны аб неабходнасьці ўзмацненьня тэмпаў работы.

Дзяржбанк, маючы вялікую запазычанасьць па сельгаскрэдытах, на працяту 2-х з паловай месяцаў ня прыняў мер да ліквідацыі запазычанасьці і не зварочваў увагі на сыгналы газэты «Камунар Магілеўшчыны». Дастатковай увагі і інструктажу Дзяржбанк сельсаветам ня даў, выезды працаўнікоў у сельсаветы былі рэдкія і выпадковыя. А самае галоўнае: дзяржбанк не зьвязаў фінансаваньне ўстаноў, арганізацый, сельсаветаў, калгасаў з вынікамі выкананьня фінансавага пляну другога кварталу. За гэта кіраўніку дзяржбанку тав. Шыманскаму абвешчана вымова.

**М. Р.**

### Заданьне па пазыцы будзе выканана

Работа па рэалізацыі пазыкі ў Межанскім р-не разгортваецца: рабочыя і служачыя раённых і сельскіх устаноў падпісаліся на пазыку на 100-120 проц. месячнага заработку. Так, напрыклад, на 120 проц. падпісаліся працаўнікі Райвыканкому, Райспажыўсаюзу, аддзяленьня Дзяржбанку, РК КП(б)Б і г. д. Усяго ўжо сабрана падпіскі на 16.000 руб. і ўзнос на пазыку будзе вытвараць а ліпеня месяца, згодна ініцыятывы рабочых і служачых.

Кампанія па рэалізацыі пазыкі сярод сялян праходзіць пад лёзунгам «калгасьнікі і аднаасобнікі—трохтыднёвы заработак на пазыку».

Дадзенае раёну заданьне працоўныя Межаншчыны абяцаюць цалкам выканаць.

**Межанец.**

### У парадку сацспаборніцтва

На агульным сходзе ячэйкі КСМ сумесна з беспартыйнай моладзьдзю калгасу «Новае Лядца» (Пухавіцкага раёну) было пастаўлена пытаньне аб рэалізацыі пазыкі трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Кожны з камсамольцаў і моладзі ў парадку сацспаборніцтва падпісаўся на пазыку і ўзяўся праводзіць падпіску сярод сялянства.

**Лёсін.**

---

У бой за торф

# Саветы, дэпутацкія групы,

## станьце ў першыя шэрагі барацьбітоў за торф, станьце на чале штурму прарываў на тарфяным Данбасе!

### Саветы, тварам да торфазаводаў

Сэзонны плян торфаздабычы па БССР на 8-га ліпеня 1931 году выкананы ўсяго на 20,4 проц. Асобныя торфазаводы ідуць да канца сэзону з вялікімі прарывамі. Так, завод «Чырвоная Беларусь» выканаў свой сэзонны плян на 0,8 проц., завод «Чырвоны Сьцяг» на 8,5 проц., «Калектыўная праца» на 7,2 проц., Смалявічы—на 2,3 проц.

Па іншых заводах выкананьне сэзонага пляну хістаецца паміж 17 і 30 процантамі.

Мы неаднаразова пісалі ўжо аб прычынах прарываў на тарфяным фронце. Сярод гэтых прычын мы ўспамінаем аб адсутнасьці неабходнай колькасьці рабочай сілы на торфараспрацоўках. Мы пісалі аб тым, што раённыя арганізацыі не зьвяртаюць належнай увагі на работу торфазаводаў. РВК і сельсаветы маглі-б аказаць больш канкрэтную дапамогу ў ліквідацыі прарываў, чым гэта мы назіраем на самой справе.

Паводле вестак, якія ў нас ёсьць, большасьць РВК ня цікавяцца становішчам работы торфазаводаў. У некаторых выпадках РВК зьяўляюцца нават тормазам у выкананьні пляну торфаздабычы. Так, гэта было з раёнам выкананучым камітэтам у Смалявічах, так гэта назіраецца па некаторых іншых раёнах.

Некаторыя РВК не адчуваюць яшчэ адказнасьці за тыя прарывы, якія стварыліся на торфазаводах. Вельмі рэдка райвыканкомы цікавяцца становішчам на торфазаводах, і прымаюць меры для ліквідацыі тых прарываў, якія там стварыліся. **Райвыканкомы яшчэ не павярнуліся тварам да торфа заводаў.**

Сельсаветы яшчэ менш цікавяцца торфараспрацоўкамі. Ёсьць выпадкі калі сельсаветы проста перашкаджаюць здабычы торфу. У мястэчку Дукоры арганізавалася тарфяная арцель і сельсавет **забараніў** гэтай арцелі здабываць торф.

Такія факты сьведчань аб тым, што гэтыя сельсаветы, і такія райвыканкомы не забясьпечваюць ударную работу на торфазаводах, не зьяўляюцца памочнікамі партыі і ўраду ў ажыцьцяўленьні тых вялізарных задач па здабываньні торфу, якія пастаўлены перад намі ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

Мала здабыць торф. Торф, які знаходзіцца на торфазаводзе, яшчэ ня можа пайсьці на апал. Яго трэба вывесьці. Торфасэзон канчаецца. Ужо зараз трэба рыхтавацца да вывазкі ўсяго загатаванага торфу.

Хто другі як ні РВК і сельсаветы павінны ў першую чаргу заняцца гэтым пытаньнем? Разьмеркаваць рабочую і гужавую сілы ў часе вывазкі, пастаўіць работу так, каб увесь торф загатоўлены ў гэтым сэзоне, быў-бы вывезены.

Амаль такі-ж удзел у торфаздабычы гэтага году прымаюць гарадзкія саветы. Яшчэ меншы ўдзел ў гэтай рабоце прымаюць дэпутацкія групы на прадпрыемствах.

Мы ня раз зьвярталіся да дэпутацкіх груп тых прадпрыемстваў, якія зьяўляюцца спажыўцамі торфу, каб яны аказалі канкрэтную дапамогу торфазаводам. Мы зьвярталіся да гэтых дэпутацкіх груп з канкрэтнымі прапановамі дапамагчы ліквідаваць прарывы на торфазаводах. Але да гэтага часу ніводная дэпутацкая група не раз вязала гэтага пытаньня шляхам канкрэтнай дапамогі.

Саветы адказваюць за выкананьне пляну торфаздабычы гэтага году нараўне з усімі іншымі арганізацыямі. Саветы павінны павярнуцца тварам да торфараспрацовак, павінны намеціць цэлы рад мерапрыемстваў, якія забясьпечылі-б выкананьне пляну здабычы торфу ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

Дэпутацкія групы на прадпрыемствах супольна з раённымі газэтамі па вінны арганізаваць цэлы рад рэйдаў-праверак як нізавыя зьвяньні саветаў дапамагаюць у справе выкананьня пляну торфаздабычы. **Гэтымі праверкамі трэба дапамагчы саветам стаць сапраўднымі кіраўнікамі гаспадарчага і палітычнага жыцьця ў раёне.**

**Б. Р.**

### Новыя сыгналы трывогі з „Чырвонага сьцягу"

На торфазаводзе «Чырвоны Сьцяг» зараз працуе тры машыны, з іх дзьве канвэйернай сыстэмы, адна вагонетачная.

Здаецца, не павінна быць ніякіх тормазаў у рабоце гэтых машын. Бываюць выпадкі, калі машыны ня маюць поўнай нагрузкі, або зусім стаяць. Так, 8-га і 9-га ліпеня машына № 2 зусім не працавала ў зьвязку з тым што разоў некалькі псавалася.

Віну цалкам трэба аднесьці на кіруючыя органы заводу, якія не зьвяртаюць ніякай увагі на тое, каб прыцягнуць вінаватых у гэтых прастоях да адказнасьці. У гэтай-жа машыне некалькі разоў гарэў падшыпнік. Зняйсьці сьлёсара для таго, каб паправіць падшыпнік нельга было. Сьлёсар у гэты час пэнствараў, а машына не працавала 1½ гадзіны.

Ня лепш справа з рабочымі-тарфянікамі. Яны ніяк ня ведаюць апроч работы на заводзе і прыйшоўшы з работы паспань. Сярод рабочых не праводзіцца ніякай культурна-масавай работы. Яны на сеньняшні дзень ня зедаюць выкананьня прамфінпляну па здабычы торфу.

У выніку гэтага, прагулы, п'янка, гулянка ў карты ідуць поўным ходам.

Насьцентазэта, якая выходзіла ўсяго два разы за ўвесь сэзон, не асьвятляе ходу выкананьня пляну па здабычы торфу. Яна не мабілізавала рабочую масу заводу на ліквідацыю гэтых прарываў.

Намечаныя дзённыя пляны ня выконваюцца нават напалову. Замест здабычы звыш 37 тыс. цаглін на адну машыну, здабываецца 17--11 тыс. цаглін, а бываюць выпадкі, што і менш, толькі 6-7.

**Брыгада газ. «Сав. Бел.»: Ладуцька і Ходаш.**

### Гнілое мяса, бруд...

Ужо ня раз пісалася ў нашым цэнтральным і нізавым друку аб тым, што сталоўка торфазаводу «Чырвоны Сьцяг» не адпавядае запатрабаваньням рабочых тарфянікаў. Якасьць абеду ў сталоўцы з кожным днём пагаршаецца.

Бываюць выпадкі, калі ў сталоўку прывозяць гнілое мяса, якое нельга есьці.

У апошні час ў сталоўку № 3 дзе харчуюцца каля 500 рабочых, правезена 100 кілёграм псаванага мяса. Рыба салёная таксама зусім на вымочваецца. Гэтыя выпадкі на торфазаводзе бываюць часта. Ніхто не цікавіцца тым, каб іх зьнішчыць.

Апроч гэтага ў сталоўцы заўсёды бруд. Міскі амаль зусім ня мыюцца. Ядуць з адной і той-жа міскі па некалькі разоў. У выніку гэтага часта бываюць выпадкі захворваньня рабочых.

Адміністрацыя і партыйна-прафэсыянальныя арганізацыі заводу ня прымаюць ніякіх мер да таго, каб палепшыць быт рабочага і санітарнае становішча сталоўкі як асноўнага цэху заводу.

Гэтак далей працягвацца ня можа. Патрэбна, каб адміністрацыя і партыйна-прафэсыянальныя арганізацыі, якія да гэтага часу спалі, заняліся гэтай справай. Выявіць зрыўшчыкаў грамадзкага харчаваньня і прыцягнуць іх да судовай адказнасьці.

**Брыгада газэты «Савецкая Беларусь».**

**Ходан, Ладуцька.**

---

# Сенаўборцы--ударныя тэмпы

## Лічаныя дні засталіся да ўборкі збожжа

### Сенаўборка да гэтага часу павінна быць поўнасьцю скончана

### Зьдзельшчына спрыяе ўдарнаму правядзеньню сенаўборкі

**Петрыкаўскі райсаюз ня дбае пра грамадзкае харчаваньне**

Калгасы Бабуніцкага сельсавету, Петрыкаўскага раёну пачалі ўборку сенажаці на 3 тыдні раней супроць летаслічэньня. Калі летась касавіца пачалася 14-га ліпеня, дык сёлета на 1-га ліпеня ўборка сена была ў самым разгары. На 3-га ліпеня была скошана і ўбрана значная частка сенажаці і ўся канюшына. Так калгас «Чырвонае Палесьсе», які летась пакінуў зімаваць 70 га, на 3-га ліпеня скасіў 110 га і ўбраў 80 га; калгас «Сяўбіт» скасіў 90 і ўбраў 70; «Завет Ільліча» скасіў 80, убраў—60 га. Малае адставаньне па калгасах «Новы Барычаў»—скошана 50 га, убрана—40, «XIII Кастрычнік»—скошана 30, убрана 20.

Прапорка таксама канчаецца, адначасова частку рабочай сілы калгасы скарыстоўваюць па лесазагатоўках.

Да ўборкі ўраджаю калгасы падрыхтаваліся, але тут наглядаюцца некаторыя недарэчнасьці. Так, напрыклад, амаль ні ў адным калгасе няма спэцыяльна прыстасаваных вялікіх пуняў, прыдзецца ўраджай разновозіць у маленькія сялянскія пуні, што будзе тармазіць абмалот ураджаю.

Дрэнна абстаіць справа з запаснымі часткамі да ўборачных машын, асабліва да жнэйрак. Недавальняюча арганізавана грамадзкае харчаваньне. Райспажыўсаюз аб гэтым вельмі мала думае.

Ня гледзячы на такія нязважлівыя адносіны з боку раённых арганізацый Бабуніцкага сельсавету, з пастаўленымі задачамі ў часе ўборачнай кампаніі спраўляюцца. Па ходзе ўборкі сенажаці можна быць упэўненым, што ўборка будзе выканана ў тэрмін.

**А. Жураўскі.**

Уборка сена ў калгасе «Чырвоны Араты», Крупскага раёну.

### Калгас „Бальшавік" ударна праводзіць сенаўборку

Калгас «Бальшавік», Ельскага раёну (в. Рамязы) па ўдарнаму прыступіў да ўборкі сена. 24-га чэрвеня калгас скончыў работу першага ўкосу канюшыны. Уборка сена таксама праходзіць пасьпяхова.

Сенаўборку калгас мяркуе скончыць не пазьней як 20-га ліпеня.

Калгас цалкам перайшоў на зьдзельшчыну. Паміж брыгадамі заключаны сацдагаворы на лепшае выкананьне работы.

**А. Каньвод.**

### Калгасы „Чырвоная Горка" і „Рэс" зрываюць уборку сена

Калгасы Стара-Дароскага раёну, Пасецкага с.-с.—«Камуна», і «Камунар» пачалі касьбу 22-га чэрвеня. Калгас «Камуна» ужо скасіў і ўбраў 38 га, «Камунар»—20 га сенажаці.

Па калгасах Кармазоўскага с.-с. касьба пачалася 24-га чэрвеня.

Сваячасова выканалі плян уборкі канюшыны калгасы: «Чырвоны Трудавік», «Чырвоны Франтавік», «Росьвет новага жыцьця» і саўгас Палажэвічы. Калгасы «Новы Селянін», і «Чырвоная Беларусь» (Дрожненскі с.-с.) па-ўдарнаму прыступілі да сенаўборкі. Скошана і ўбрана больш 60 га.

Дрэнна падрыхтаваліся да сенаўборкі калгасы: «Чырвоная Горка» і «РЭС», якія толькі цяпер агледзеліся, што няма ў і хкос. Недахопам у работе калгасаў зьяўляецца адсутнасьць рабочых плянаў, няпоўнае скарыстаньне рабочай сілы. Большасьць калгасаў нават і саўгас Палажэвічы яшчэ не перайшлі на зьдзельшчыну.

**Ш. М.**

### Па-бальшавіцку змагаюцца за кармовую базу

**Вушачы. (Белта).** Калгасы Вушацкага раёну — «Чырвоны Кастрычнік», «Барыкада», «Будзь гатоў», «Адважны барацьбіт», дзякуючы шырока разгорнутаму ўдарніцтву, сацспаборніцтву і правільнаму вучоту працы дамагліся значных посьпехаў ва ўзьняцьці прадукцыйнасьці працы і ўцягненьні жанчын у работу. Калі ў пачатку на работу выходзіла 5-6 жанчын, дык зараз усе жанчыны выходзяць на работу. Брыгада касцоў-калгаснікаў перавыканала заданьня на 20 проц. Жаночая брыгада ў складзе 30 жанчын па зграбаньні сена да ўвядзеньня зьдзельшчыны зграбала 10 га, а пасьля такую-ж колькасьць выконвала 16 жанчын. Па тэрмін калгасах канюшына і заліўныя сенажаці ўбраны. Касьба і ўборка падыходзяць да канца.

### Наш лёзунг—не адстаць ад рабочых

Дзякуючы ўдарнай рабоце і энтузіязму ўсіх калгасьнікаў — ударнікаў, калгас імя Энгельса (Уваравіцкі раён) па-ўдарнаму скончыў сяўбу і ўборку канюшыны на плошчы ў 152 га.

Адрача гэтага скошана сухадольнай і заліўной сенажаці 46 га, з якой большая палова высушана і ўбрана. Калгасьнікі заявілі, што будуць змагацца за другі ўкос канюшыны. Гэтых бліскучых посьпехаў калгас дамогся дзякуючы ўдарнай рабоце калгасьнікаў.

Калгасьнікі на агульным сходзе вырашылі падпісацца на пазыку «Трэці рашаючы» ў разьмеры месячнага заработку. Ужо падпісаліся на суму 2.425 руб. Падпіска працягваецца. Калгасьнікі выклікаюць усе калгасы Гомельшчыны пайсьці па іх прыкладзе і падпісацца на ня менш свайго месячнага заработку.

— Наш лёзунг,—кажуць яны,—не адставаць ад рабочых Гомлю.

**Ржавуцкі Яман.**

---

За 1 млн тон сілосу

# У штурм за сілос!

### Чачэвіцкі, Крупскі, Клічаўскі раёны зрываюць будаўніцтва сілосных установак і пляны сілясаваньня. Белкалгасцэнтр і Белсельбуд марудзяць з устаноўкай адгружаных вежаў

### Ямы і траншэі чакаюць сілос. Ня даць загінуць ніводнай жменьцы травы, ніводнаму каліву пустазельля

### Фарсаваць будаўніцтва і ўстаноўку сілосных вежаў

Ня гледзячы на трывожныя сыгналы друку і савецкай грамадзкасьці аб вельмі марудных тэмпах будаўніцтва сілосных вежаў, да апошняга часу ў гэтай галіне няма яшчэ належнага пералому. На 10-га ліпеня нашымі заводамі адгружана ўсяго 136 вежаў ці 35 проц.; Бабруйскі камбінат адгрузіў 78 вежаў ці 27 проц., завод «Дрэваапрацоўшчык»—58 вежаў ці 58 проц.

Справа будаўніцтва сілосных вежаў ня можа цягнуцца гэтак. Ня гледзячы на зварот НКЗ-ему і Белсельбуду да партыйных і прафэсыянальных арганізацый і адміністрацыйна-тэхнічнага кіраўніцтва Бабруйскага камбінату і заводу «Дрэваапрацоўшчык» аб узмацненьні тэмпаў выпуску сілосных вежаў, гэты заклік застаўся без адказу, да апошняга часу няма яшчэ пералому ў рабоце. Партыйная і прафэсыянальная грамадзкасьць гэтых заводаў павінна паварнуцца тварам да пытаньня стварэньня моцнай кармовай базы, у бліжэйшыя дні неабходна дабіцца ўдарных тэмпаў па выпуску сілосных вежаў.

Але мала адгрузіць вежы, іх трэба яшчэ ўстанавіць. І на гэтым вучастку ў нас--яўная небясьпека. Да 10-га ліпеня ніводная з адгружаных вежаў не ўстаноўлена. Па лініі Белкалгасцэнтру, паводле вестак 36 раёнаў, будуецца 15 вежаў, але ніводная з іх не пабудавана: капаюцца катлаваны, будуюцца падмуркі і г. д. Саўгасы Белсаўгастрэсту атрымалі 30 вежаў, але пакуль-што вядзецца ўстаноўка толькі аднэй. Саўгасы «Сьвіраводу» атрымалі 16 вежаў, але для ўстаноўкі іх выкапана ўсяго 5 катлаванаў і будуюцца 2 падмуркі.

Пададзеныя факты сыгналізуюць аб тым, што ёсьць яўная пагроза зрыву сваячасовай устаноўкі сілосных вежаў. Белкалгасцэнтр і Белсельбуд павінны пасапраўднаму ўзяцца за ўстаноўку сілосных вежаў, каб забясьпечыць, сканчэньне пабудовы сілосных вежаў у вызначаныя ўрадам тэрміны.

Сілос не чакае, трэба дамагчыся ў самы кароткі тэрмін устаноўкі ўсіх адгружаных вежаў і запаўненьня іх зялёнай масай.

### Камсамол не дапамагае пра вядзеньню сілясаваньня

Па калгасах Крупскага раёну да сілясаваньня кармоў не прыступаюць. Ні ў адным калгасе нічога ня робіцца ў гэтай галіне. Ня ўсе нават калгасы засеялі сілосныя культуры. Ёсьць такія, калгасы, якія скарацілі пасеўную плошчу сілосных культур.

Камсамольскія арганізацыі Крупшчыны стаяць у баку ад стварэньня кармовай базы і ня прымаюць ніякага ўдзелу ў гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі. Камсамольскія ячэйкі нават не абгаворвалі пытаньня аб правядзеньні сілясаваньня кармоў.

Камсамол Крупшчыны павінен пабальшавіцку ўзяцца за правядзеньне сілоснай кампаніі.

**Селькор.**

### „Есьць больш важныя справы, чым сілясаваньне"

Старшыня камуны імя **Карла Маркса**, Чачэвіцкага раёну, тав. Мулеў лічыць сілясаваньне кармоў самай апошняй справай. Плян сілясаваньня зрываецца, на сваячасовую пабудову сілосных установак праўленьне калгасу не зварочвае ніякай увагі, матывуючы гэта тым, што ў яго «ёсьць больш важныя справы, чым сілясаваньне».

За злосны зрыў мерапрыемстваў па сілясаваньні кармоў мы патрабуем прыцягненьня да адказнасьці кіраўніцтва калгасу імя Карла Маркса.

**Алесь.**

### Папярэдзіць зрыў будаўніцтва сілосных установак

**Крычаўшчына ня дбае пра сілас**

Калгасы **Крычаўшчыны** павінны сёлета засілаваць 4.243 тоны зялёнай масы. Аднак, рад раённых арганізацый і сельсаветаў ня прымаюць рашучых захадаў да разгортваньня гэтай кампаніі. Райкалгассаюз і райкаапсаюз праяўляюць злачынную бязьдзейнасьць у правядзеньні сілосных кампаній, яны абмяжоўваюцца толькі рассыланьнем пляну, але нічога ня робіць каб праверыць, як гэтыя пляны праводзяцца ў жыцьцё. Да апошняга часу ня прыступлена да будаўніцтва сілосных установак, нічога ня робіцца па сілясаваньні кармоў.

Сярод значнай часткі калгасаў ёсьць тэндэнцыя да скарачэньня праграмы сілоснага будаўніцтва (Зарубецкі сельсавет). Кіраўніцтва сілосным будаўніцтвам у раёне ўскладзена на тэхніка Мельнікава, які сьвядома агітаваў сярод калгасьнікаў супроць будаўніцтва сілосных вежаў, бо «трэскаюцца, рассыхаюцца, крывяцца» (?!) У выніку гэтай агітацыі, рад калгасаў катэгарычна адмаўляецца будаваць вежы.

Паводле плянаў, у чэрвені павінна быць выканана пабудова 30 проц. сілосных установак, а да канца ліпеня цалкам закончыць. Між тым, да гэтага часу большасьць калгасаў не прыступаюць да работы. У Маляшкім сельсавеце, апрача калгасу «1-га мая», ня прыступлена да будаўніцтва ям і траншэй. Некаторыя калгасы зусім ня маюць плянаў сілясаваньня, а тыя якія маюць, не давялі іх да шырокіх калгасных мас.

Наогул, плян сілясаваньня па Крычаўскім раёне выкананы на 0,5 проц. Зрыў плянаў пасеву сілосных культур абавязвае калгасы выкарыстаць усякую зеляніну для сілясаваньня, але гэтага не робіцца.

Трэба неадкладна прыступіць да ліквідацыі прарываў. Райкалгассаюзы і сельсаветы павінны па-ударнаму ўзяцца за правядзеньне сілоснай кампаніі.

**Д. Алан.**

### Засілясавана 75 тон масы

Камуна імя Леніна, Чачэрскага раёну, плян веснавой сяўбы выканала цалкам. Зараз камуна прыступіла да ўборкі сенажацяй. Ударна праводз

# АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

## Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

# па справаздачы аб дзейнасьці Цэнтральнай камісіі дапамогі дзецям пры ЦВК БССР за пэрыяд часу з 1-X—29 г. па 1-VI—31 г.

Заслухаўшы справаздачу Цэнтральнай камісіі дапамогі дзецям пры ЦВК БССР за пэрыяд часу з 1-X—1929 г. па 1-VI—1931 г., Прэзыдыум Цэнтральнага выканаўчага камітэту БССР адзначае, што ў выніку вялізарнага эканамічнага росту краіны, значных дасягненьняў у справе культурнага будаўніцтва і праведзеных дзяржаўнымі ўстановамі і грамадзкімі арганізацыямі мерапрыемстваў,—вулічная дзіцячая бяспрытульнасьць у асноўным ліквідавана.

За мінулы час ЦК дапамогі дзецям і т-вамі «Прыхільнік Дзяцей» праведзена значная работа па падборы бяспрытульных дзяцей з вуліцы, па арганізацыі і пашырэньні майстэрняў для бяспрытульных дзяцей з мэтай працоўнага іх выхаваньня, па ўпарадкаваньні бяспрытульных на працу, па правядзеньні ў жыцьцё пэлага шэрагу прафілактычных мерапрыемстваў, папярэджваючых дзіцячую бяспрытульнасьць (арганізацыя дзіцячых сталовак, ясьлей, агульных памяшканьняў і гэтак далей).

З асноўных недахопаў у справе барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю адзначыць наступныя: недастатковы кантроль з боку ЦК ДД за дзейнасьцю цэнтральных і мясцовых устаноў і арганізацый у справе аховы дзяцінства і барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю, слабае рэагаваньне на маюныя прарывы ў жыцьці і працы дзіцячых дамоў, недастаткова рашучая барацьба з злоўжываньнямі, якія былі выкрыты за апошні час у жыцьці і рабоце дзіцячых дамоў, недастатковая арганізацыя грамадзкасьці з боку таварыства «Прыхільнік Дзяцей» у справе выкананьня асноўнай задачы тав-ства па дапамозе камуністычным выхаваньні дзяцей, ухіленьне таварыства ў бок камэрцыйнай дзейнасьці, што адсоўвала ў бок асноўныя задачы, стаячыя перад ТПД, як грамадзкай арганізацыі; недастатковая праца па прыцягненьні савецкай грамадзкасьці да справы барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю і безнаглядзнасьцю; з боку ЦК ДД не распрацаваны сыстэматычныя мерапрыемствы і няўжыты належныя захады для забесьпячэньня належнымі ўмовамі да прыстасаваньня да жыцьця, выхаванцаў, якія выпушчаюцца з дзіцячых дамоў.

Выходзячы з гэтага Прэзыдыум ЦВК БССР **пастанаўляе:**

1. Прапанаваць Цэнтральнай камісіі дапамогі дзецям у далейшай сваёй дзейнасьці паставіць, як першачарговую задачу:

а) мабілізацыю шырокіх мас працоўных вакол практычных задач камуністычнага выхаваньня дзяцей і падрыхтоўкі кадраў для сацыялістычнага будаўніцтва. Выходзячы з таго, што асноўнай арганізацыяй, якая павінна арганізаваць пралетарскую грамадзкасьць навакол пытаньня мэтадычнага выхаваньня дзяцей зьяўляецца таварыства «Прыхільнік Дзяцей», прыняць належныя крокі для дапамогі Аркамі тэту ў падрыхтоўцы і правядзеньні Ўсебеларускага Зьезду, выбарах Цэнтральнага праўленьня гэтага таварыства і разгорваньні гэтым таварыствам адпаведнай работы.

б) Узгадненьне дзейнасьці ўсіх устаноў і арганізацый на ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў па барацьбе з рэшткамі дзіцячай бяспрытульнасьці, на арганізацыю справы па змаганьні з дзіцячай безнаглядзнасьцю, ужываньне захадаў па палепшаньні становішча работы дзіцячых дамоў, на мерапрыемствы па ахове дзяцінства, на разгортваньне мерапрыемстваў прафілактычнага характару для папярэджаньня дзіцячай бяспрытульнасьці, па ўпарадкаваньні на працу выпушчаемых з дзіцячых дамоў выхаванцаў з ажыцьцяўленьнем мерапрыемстваў для іх поўнага прыстасаваньня да жыцьця і актыўнага ўдзелу ў справе сацыялістычнага будаўніцтва.

в) Праверку выкананьня пастаноў урадавых органаў па ўсіх пытаньнях, зьвязаных з выхаваньнем, вучобай і працай дзяцей і падлеткаў, з аховай іх правоў і здароўя, а таксама ўдзел у ажыцьцяўленьні мерапрыемстваў па палепшаньні бытавога становішча дзяцей, у першую чаргу дзяцей рабочых калгасьнікаў, батракоў і беднаты.

2. Канстатуючы, што з боку паасобных раённых выканаўчых камітэтаў і гарадзкіх саветаў зварочвалася зусім недастатковая ўвага справе барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю і безнаглядзнасьцю, прапанаваць апошнім устанавіць больш сталы нагляд за ўмовамі жыцьця і работы дзіцячых дамоў, а таксама ўзмацніць сваё кіраўніцтва работай па барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю і безнаглядзнасьцю.

3. Ухваліць мерапрыемствы ЦК ДД па рэарганізацыі Ўсебеларускай дзіцячай камуны ў гор. Магілёве ў школу сельгасвучу з дзьвюма аддзяленьнямі—садова-гародным і жывёлагадоўчым.

4. Даручыць ЦК ДД зьвярнуць асаблівую ўвагу на барацьбу з дзіцячай бяспрытульнасьцю на транспарце і разам з упаўнаважаным НК Шляхоў Зноскін і Наркамасьветы ўжыць адпаведныя захады да выкананьня дадзеных раней у гэтым напрамку прапаноў.

5. Даручыць Наркампрацы разам з ВСНГ і прафсаюзнымі арганізацыямі ўжыць адпаведныя захады да прыняцьця ў школы фабрычна-заводзкага вучнёўства дзяцей дзіцячых дамоў і бяспрытульных.

Даручыць таварыству «Прыхільнік Дзяцей» і Цэнтральнай камісіі дапамогі дзецям ужыць рашучыя захады да палепшаньня дабрабыту паказаных дзяцей, у паасобку, у справе арганізацыі для іх грамадзкіх памяшканьняў і палепшаньня жыльлёвых умоў.

6. Прапанаваць райвыканкомам і гарсаветам ужыць рашучыя захады для разгортваньня работы таварыства «Прыхільнік Дзяцей», дапамагаючы кіраўніцтвам у практычнай дзейнасьці па барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю на мясцох.

7. Даручыць Сакратарыяту ЦВК разгледзіць баланс за 1929-30 г. і асобны квартал 1930 г. і фінансавы плян па мерапрыемствах Цэнтральнай Камісіі Дапамогі дзецям—па ахове дзяцінства і па барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю і безнаглядзнасьцю на 1931 г.

8. Заслухаць на наступным пасяджэньні Прэзыдыуму ЦВК БССР даклад Арганізацыйнага камітэту па скліканьні Ўсебеларускага Зьезду таварыства «Прыхільнік Дзяцей».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
**А. Чарвякоў.**
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
**М. Гіляжевіч.**

**29-га чэрвеня 1931 г.**
**г. Менск.**

## Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

### пра захаваньне за інжынэрна-тэхнічнымі і адміністрацыйна-гаспадарчымі работнікамі, якія прыцягваюцца для работы на ўдарных будаўніцтвы, права на жылую плошчу, што знаходзіцца ў ранейшым месцы пражываньня

Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. За інжынэрна-тэхнічнымі і адміністрацыйна-гаспадарчымі работнікамі (уключаючы дзесятнікаў), якія прыцягваюцца для работы на ўдарных будаўніцтвах (па сьпісу, які зацьверджаецца Саветам Працы і Абароны), захоўваецца на ўвесь час работы на гэтых будаўніцтвах права на жылую плошчу ў ранейшым месцы пражываньня ва ўсіх дамох грамадзкага сэктару, а таксама ў прыватных дамох.

2. З выданьнем гэтай пастановы, якая цалкам рэгулюе пытаньне аб захаваньні жылой плошчы за інжынэрна-тэхнічнымі і адміністрацыйна-гаспадарчымі работнікамі, якія прыцягваюцца для работы на ўдарных будаўніцтвах, трацяць сілу пастановы СНК БССР:

а) пра захаваньні права на жылую плошчу за інжынэрна-тэхнічным і адміністрацыйна-гаспадарчым пэрсаналам, які запрашаецца для работы на будаўніцтвах Магнітагорскага, Кузьнецкага і Пятроўскага (у Забайкальлі) мэталюргічных заводаў (З. З. БССР 1930 г. № 38, паст. 258);

б) пра жыльлёвыя льготы для інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу, які запрашаецца для работы на будаўніцтва Днепракамбінату (З. З. БССР 1931 г. № 5, паст. 40);

в) пра жыльлёвыя льготы для інжынэрна-тэхнічнага і адміністрацыйна-гаспадарчага пэрсаналу, які запрашаецца для работы на будаўніцтва Кузбаса (З.З. БССР 1931 г. № 6, паст. 48);

г) пра жыльлёвыя льготы для інжынэрна-тэхнічнага і адміністрацыйна-гаспадарчага пэрсаналу, які запрашаецца для будаўніцтва Нова-Тагільскага мэталюргічнага заводу (З. З. БССР 1931 г. № 17, паст. 140);

д) пра жыльлёвыя льготы для работнікаў, якія запрашаюцца для будаўніцтва прадуктапрадвода Армавір-Украіна (З.З. БССР 1931 г. № 18, паст. 149).

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР. **С. Кандыбовіч.**

2 ліпеня, 1931 г., г. Менск.

## Пастанова ЦВК і СНК БССР

### аб скасаваньні абзацу другога арт. 12 Палажэньня пра судабудаўніцтва БССР

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР—пастанаўляюць:

Абзац другі арт. 12 Палажэньня пра судабудаўніцтва БССР («Савецкая Беларусь» за 17 мая 1931 г. № 110)—скасаваць.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
**А. Чарвякоў.**
Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **К. Бэнэк.**
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гіляжевіч.**

5 ліпеня, 1931 г.

Будаўніцтва лёназавода і ў Крупках.

## Пастанова Эканамічнага Савету БССР

### пра парадак скарыстаньня фонду рэканструкцыі сельскагаспадарчага мукамольля

У адпаведнасьці з пастановай СНК БССР «Пра памольны збор», Эканамічны Савет БССР **пастанаўляе:**

1. Устанавіць, што фонд рэканструкцыі сельска-гаспадарчага мукамольля, які знаходзіцца пры Саюзхлебе цалкам скарыстоўваецца на фінансаваньне будаўніцтва млыноў па лініі дзяржаўнай прамысловасьці мясцовага значэньня і калгасаў.

2. Сродкі фонду рэканструкцыі сельскагаспадарчага мукамольля знаходзяцца ў Беларускай Канторы Дзяржбанку ў якасьці ўмоўнага ўкладу і скарыстоўваюцца на фінансаваньне па казаных у арт. 1 мерапрыемстваў па плянах, якія зацьвярджаюцца Эканамічным Саветам БССР.

3. Сродкі на фінансаваньне будаўніцтва і рамонту млыноў па лініі дзяржаўнае прамысловасьці і мясцовага значэньня выдаюцца раённым выканаўчым камітэтам, як беззваротныя ўклады і сьпісваюцца з паказанага ў арт. 2 ўмоўнага ўкладу на падставе спэцыяльных распараджэньняў Народнага Камісарыяту Фінансаў.

4. Сродкі для фінансаваньня калгасаў па рамонт і будаўніцтва млыноў і будаўніцтва новых выдаюцца як зваротныя пазыкі на падставе ўмоў, якія існуюць для доўгатэрміновага і льготнага крэдытаваньня млыннае справы.

У асобных выпадках (зьнішчэньня млыноў пры навальных бядотах) гэтыя сродкі могуць выдавацца ў якасьці беззваротнага фінансаваньня па хадайніцтвам раённых выканаўчых камітэтаў.

Пытаньне аб беззваротных выдачах вырашаецца Народнымі камісарыятамі: Земляробства, Фінансаў і Снабжэньня і зацьвярджаецца Эканамічным Саветам БССР.

5. Пазычкі разам з устаноўленымі процантамі на іх, якія зьвяртаюцца калгасамі залічваюцца, апроч сум, якія належаць банку за камісію, ў ўмоўны ўклад, які паказаны ў арт. 2 гэтае пастановы.

6. Прапанаваць Беларускай Канторы Саюзхлебу:

а) спэцыяльны бягучы рахунак у Беларускай Канторы Дзяржбанку пералічыць на ўмоўны ўклад паводле арт. 2 гэтае пастановы;

б) штомесячна на працягу 5 дзён пасьля складаньня справаздачы за мінулы месяц аб колькасьці паступіўшых сум апошнія пералічваюцца Саюзхлебам на ўмоўны ўклад у Дзяржбанку.

7. Адказнасьць за скарыстаньне па прызначэньні атрыманых на млыннае будаўніцва сум ускладаецца на Белкалгасцэнтр і адпаведныя раённыя выканаўчыя камітэты.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР
**К. Бэнэк.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР
**С. Кандыбовіч.**

**11 ліпеня 1931 г.**
**гор. Менск.**

## Праваруць становішча і скарыстаньне муніцыпалізаванага фонду ў гарадох і мястэчках БССР

Галоўнае кіраўніцтва Камунальнай гаспадаркай пры СНК БССР пачало праверку становішча і скарыстаньня муніцыпалізаванага фонду БССР.

Месцам, па лініі камунальных органаў, у другой палове чэрвеня дасланы належныя інструкцыі як праводзіць гэту работу, а па лініі Гарсаветаў і Райвыканкомаў—адозвы з просьбай аказаць патрэбную дапамогу.

Уся работа павінна быць выканана да 25 ліпеня бягучага году пасьля чаго на бліжэйшым пасяджэньні ЦВК Галоўкамгас будзе рабіць справаздачу аб выніках праверкі.

Праверка ставіць сабе мэтаю выявіць наяўнасьць жыльлёвай плошчы муніцыпалізаванага фонду, хто непасрэдна ею карыстаецца і ў якім разьмеры, як утрымліваюцца жылыя будынкі, выявіць наяўнасьць будынкаў гандлёвых, складачных і інш., якія можна адбудаваць пад жыльлё.

Па сваёй сутнасьці і аб'ёму гэта работа настолькі вялікая і адказная, што апэрацыйным складам работнікаў камунальнай гаспадаркі, без дапамогі шырокай пралетарскай грамадзкасьці яе нельга выканаць. Таму, органы камунальнай гаспадаркі, на чале з Гарсаветамі і Райвыканкомамі, павінны ўжыць усе захады да таго, каб мабілізаваць думку грамадзкасьці вакол гэтага пытаньня і праз арганізацыю бригад з рабочых, актыву ЖАКТА'у, прафсаюзаў і іншых арганізацый утварыць абсьледваньне жылфонду ў вызначаны тэрмін.

**Коршун.**

# ШАХМАТЫ І ШАШКІ

**№ 9 (224)**

**Пад рэдакцыяй А. А. Касьперскага**

## Прысьвячаюцца 11-гадзьдзю аслабаненьня Беларусі ад белапалякаў

Задача № 6
Я. Камянецкага (Менск)



Белыя: Кр f1. Ф f5, Cd1 п d5 (4)
Чорныя: Кр e3, пп d2, d4, f2, f4 (5)

Задача № 7.
Л. Гугеля (Масква)



Белыя: Кр e1. Фe5, Ke2 (3)
Чорныя: Кр e3, Ce4 (2)

МАТ У 2 ХАДЫ.

### Дасягненьні шахматна-шашачнай работы за 11 гадоў.

11 год аму назад, пасьля аслабненьня Беларусі ад белапалякаў, шахматна-шашачнага руху зусім ня было.

Пачынаючы з 1921-22 г г. зрушылася шахматна-шашачная работа. У гэты час кадры актыўных працаўнікоў былі невялікія—па шахматах: Шукевіч-Трэньцінкоў, А. Касьперскі, С. Розэнгаль у Менску і па шашках: А. П. Круталевіч, Б. П. Круталевіч (-|-) Менск, Я. Х. Гордзін—Бабруйск. Але аднаўляючы сваю гаспадарку, працоўныя БССР зацікавіліся і шахматна-шашачнай справай і пры дапамозе савецкай улады пад кіраўніцтвам партыі пачынаец а буйны росквіт шахматна-шашачнай ігры ў межах БССР. Адчыняецца шэраг шахматна-шашачных гурткоў, праводзяцца спаборніцтвы мясцовыя і ўсебеларускія, высоўваюцца ў першыя шэрагі маладыя ігракі па шахматах: Сташэўскі — Гомель, Блюмберг, Сіліч—Віцебск, Маневіч—Гомель і інш, па шашках: Бр. Гардоны, Прэсман у Менску, Міроціи, Рудзін у Гомелі і інш. Прадстаўнікі БССР на ўсесаюзных спаборніцтвах займаюць высокія месцы. Так у 1927 годзе шахматная каманда БССР на ўсесаюзных камандных шахматных спаборніцтвах займала першае месца і в-шэй РСФСР, УССР і інш. У 1929 г. трэцяе месца, ніжэй зборнай ВУЗ'аў і 1-й УССР.

У сучасны момант па БССР налічваюцца сотні шахматна-шашачных гурткоў, налічваецца каля 10.000 арганізаваных шахматыстаў і шашыстаў. Вырас значны актыў, высунулася значная колькасьць шахматыстаў і шашыстаў і шахматных і шашачных кампазытараў.

### БІБЛІАГРАФІЯ

**У апошні час выйшлі шэраг новых шахматных кніг:**

1. Я. Рабіновіч „Дэбют"—тэма не новая, але ў трактоўцы аўтара кніга чытаецца з цікавасьцю і аматарам прынясе карысьць. Кніга разьбіта на разьдзелы: 1) асноўныя дэбютныя прынцыпы,—стратэгія: „гішпанская партыя, ферзевы, гамбіт, вест-індзкая абарона, ост-індзкая абарона і полуіндыйская абарона, 2) дэбютная стратэгія і тактыка: 1) разьвіцьцё, 2) пешачны і фігурны цэнтр, 3) атака і абарона. Кніга выдана добра. Шкада—цана высокая 4 р. 75 к.

2. У выданьні фізкультура і турызму выйшла кніжка Л. А. Ісаеў „Як складаць шахматныя задачы". стр 110, цана 60 к. Кніжка сваячасовая. чытаецца з выключнай цікавасьцю. Кніга карысная для шахматнага аматара.

3 У тым жа выданьні выйшла кніжка А. Ф. Ільяін-Жаневўскі „Міжнародны рабочы шахматны рух і савецкая шахарганізацыя", стр 48 цана 20 кап. Кніжка рэкамэндуецца кожнаму аматару.

# АПАВЯШЧЭНЬНІ

**14-VII—31 г., а 7-ай гадзіне ўвечары ў Інстытуце Гісторыі Партыі пры ЦК КП(б)Б склікаецца нарада арганізатараў і былых кіраўнікоў камсамолу Беларусі. На нараду запрашаюцца наступныя таварышы:**

**Міляўскі, Гуцін, Міляўскі (шчотачная ф-ка), Пішчыкаў (верхсуд), Ліўшыц (завод Бальшавік), Фрыдлянд (падзів 2), Кантаровіч (6 стр. полк), Ратнэр (хім. інстытут), Кроль (Камвуз), Эфроімскі, Штэйман, (саюз гарбароў), Олікер (мэд. інстытут), Вайнеровіч (міліцыя), Галавач (БелАПП), Дзяніскевіч.**

**Нам. дырэктара Інстытуту Гісторыі Партыі пры ЦК КП(б)Б**
**КАНАКОЦІН.**

Менская Гарадзкая КК КП(б)Б-РСІ паведамляе, што 15 ліпеня з 6 гадз. увечары ў памяшканьні Гаркому КП(б)Б (Энгельса 28, 3-ці паверх) адбудзецца чарговы пленум Мен. Гар. КК КП(б)Б з наступнай абесткай дню:

1) Падрыхтоўка Менскага вузла да асеньня-зімовых перавозак.
2) Аб капітальным будаўніцтве.
3) Даклады ДПК 2 і 7.
4) Арганізацыйныя пытаньні.

На пленум павінны абавязкова зьявіцца ўсе члены Гар. КК КП(б)Б. Таксама павінны зьявіцца: па 1 дакладзе сакратары п-калектываў і ячэек транспарту, старшыні заўкомаў і мясцкомаў, начальнікі станцый, прадстаўнікі ЦК Чыгуначнікаў і ўпаўнаважаны НКШЗ.

Па другім пытаньні павінны зьявіцца—сакратары парткалектываў і ячэек, прадстаўнікі Белбудаб'яднаньня, Менбуду і Жылсаюзу.

Па 3-м пытаньні—сакратары палкавых парткалектываў і сакратары парткалектываў прадпрыемстваў.

Просьба да ўсіх зьявіцца сваячасова без спазьненьняў.

Старшыня Менскай Гар. КК КП(б)Б-РСІ **КЕНІГ.**

**Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.**


**БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА** **ВЫШЛА З ДРУКУ** **СЭКТАР КНІГАРАСПАЎСЮДЖВАНЬНЯ**

**І. СТАЛІН. Новая абстаноўка—новыя задачы гаспадарчага будаўніцтва.** **ТЫРАЖ 20.000** **ЦАНА 3 кап.**

(ПРАМОВА НА НАРАДЗЕ ГАСПАДАРНІКАЎ 23-га ЧЕРВЕНЯ 1931 г.).

ПРОДАЖ УТВАРАЕЦЦА ВА ЎСІХ КНІГАРНЯХ БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА, СПАЖЫЎКААПЭРАЦЫІ І САЮЗДРУКУ



# ЦЫРК-КІНО-ТЭАТР

**Мендзяржтэатр**
СЁНЬНЯ гастроль расійскай опэры пад кіраўніцтвам Я. Е. Воўкава
— ПРЭМ'ЕРА —
**Барыс Гадуноў** муз. Мусоргскага
Пачатак а 8 гадзіне
Білеты ў раб. касе з 12-2 і з 4-6 г. У касе тэатру з 12-2 і з 5-9 гадз. увеч.

**Дзяржцырк**
**СЁНЬНЯ І ШТОДЗЁННА**
1 гастроль эўрапэйскага атракцыёну ілюзіяністаў МАРЧЭС з яго трупай ліліпутаў
2. ДОНВАЛЬДА—Татарская труппа
3. ЭРНАНІ—Музычныя эксцэнтрыкі
4. АЎТАМАТ-ЛЯЛЬКА—Фроэ
5. ЖАКЕЙ АЛЕКСАНДР
Пачат. а 8 г. 45 х. увечары
Льготныя білеты ў рабкасе

**Кіно-тэатр „Культура"**
Толькі 3 дні 13, 15, 16 ліпеня 2 карціны
1. Норд Ост—Зоя Валеўская і Мічурын.
2. Неспакойныя суседзі Амэрыканская камэдыя.
Пачатак а 7 гадзіне.

**Кіно „Інтэрнацыянал"**
З 13-га ліпеня замежны фільм
**Жонка статс-сакратара**
Пачатак а 7 гадзіне

**Кіно „Пралетары"**
Мастацкі фільм па роману Бярковіча
**ЦЫГАНСКАЯ КРОЎ**
Пачатак а 2, 3-45, Вяч. а 7, 8-45 і 10-30 г.

**Гукавы кіно-тэатр „Чырвоная Зорка"** ■ **З 13 ліпеня і штодзённа**
ПЕРШЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
**ПУЦЁЎКА Ў ЖЫЦЬЦЁ**
ДРАМА Ў 34 ЭПІЗОДАХ
Вытворчасьць гукавой фабрыкі „Рот Фронт"
У пралёге і эпілёге Народны артыст рэспублікі КАЧАЛАЎ. У гал. ролях: Н. Баталаў. М. Жараў і інш.
Папярэдні продаж білетаў толькі для арганізаў. гледача ў тэатральнай рабочай касе штодзённа.


**На паседжаньне Мандатнай Камісіі Гарсавету,**
**якое адбудзецца 14-га ліпеня а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні Гарсавету,**

**выклікаюцца наступныя члены і кандыдаты Савета, дзеля дачы тлумачэньняў аб іх пасьўным удзеле у працы Гарсавету:**

Банцярчук Я., Барысюк В., Бяленькі З., Бічэўскі М., Бурштэйн С., Віноградаў Х., Высяўка С., Гарбатаў В., Генько У., Герасімовіч М., Грыб А., Дзяржынскі Я., Дзяціна С., Есюнін С., Залескі А., Зантовіч К., Зарембоўскі К., Заранкевіч І., Злотнікаў, Зубенка Д., Зубік А., Кавалеў Г., Казак С., Казел І., Кантаровіч Ч., Канцлер Б., Каплуноў А., Каралюк У., Караўў М., Карніцкая М., Касоўскі Х. Каўшовік С., Кац Л., Кіненварма А., Кісялёў Ц., Котаў І., Крапіневіч С., Кукелка І., Куксік І., Ламан Н. Лёўка С., Ліпніцкая Г., Лісіца С., Любін Н., Любірт М., Ляхаўскі Р., Мароз А., Матусаў А., Мілейша Н., Мруц І., Міхалоўскі Э., Мурашка Ф., Мядзьвецкая Г. Нарэйка Я., Науменак Я., Новікава К., Папенкоў П., Паўловіч Г., Плаўнік Б., Плусьцін Я., Рапчынскі А., Романовіч Р., Рэшар Г., Раманенка П., Рэзьнік Л., Сабіла П., Саевіч П., Саковіч Л., Самаркін А., Сьвярдлінскі Я., Слонім С., Трапашка Р., Хавыка Н., Хаскін І., Хількевіч В., Цяўлоўская Э., Чаплінскі К., Шуеўская А., Штэйнман К., Шыбалоўкін А., Ясінскі Х., Эйлаховіч, Брыгневіч А., Вуліч Ю., Грузакоў Д., Данкаўцоў А., Дзергач І., Зеньковскі Л., Іванаўскі А., Карповіч У., Кісель А., Кузьмінова С., Мерэнштэйн Я., Новаш І., Плісан Р., Пакроўская. Пляшко А., Рагацкі І., Ракша В., Рапніцкая В., Сіяко Н., Шышкін М., Мінц М.

**Мандатная камісія**


**Менскі Фінансава-Эканамічны Тэхнікум**
пры НКФ БССР
**АБВЯШЧАЕ НОВЫ ПРЫЁМ**
**НА ПЕРШЫ КУРС ТЭХНІКУМУ**
**з 1 чэрвеня па 1 жніўня.**

Тэхнікум мае 4 аддзяленьні:
1. Фінансавае. 2. Банкаўскае. 3. Ашчаднае. 4. Ракунковае.

Мэта тэхнікуму:

Падрыхтоўка эканомістых-фінансаў. сярэдняй кваліфікацыі. Для фінансавай банкаўскай і крэдытнай сыстэмы. Прымаюцца асобы не маладзей 16 год, з асьветай ня ніжэй курсу сямігодкі.

Да заявы прыкладаюцца:

а) зацьверджаная анкета па форме, устаноўленай для паступаючых у тэхнікум; б) дакумант аб асьвеце; в) дакумант аб сацыяльным становішчы і паходжаньні. Сяляне прадстаўляюць даведку ад с-савету аб аплаце с.-г. падатку; г) выпіска аб нараджэньні; д) мэдычная даведка аб стане здароўя.

Скончыўшыя сямігодкі да 1929 г. падлягаюць іспытам па наступным прадметам: грамадазнаўстве, матэматыцы і беларускай мове.

З агульнага ліку прынятых—55 проц. будуць забясьпечаны стыпэндыяй і інтэрнатам. Заявы і дакументы накіроўваць па адрасу: Менск, Савецкая № 59, (другі паверх) Фінансава-Эканамічны Тэхнікум.

**У бягучым навучальным годзе будзе прынята 130 асоб. Заняткі пачнуцца 1 верасьня.**

**Тэрмін навучаньня—3 гады.**

1—2 Дырэктар тэхнікуму А. Казакоў.


**—КУРСЫ СЦЭНАРЫСТЫХ—**
**ПРЫ БЕЛДЗЯРЖКІНО АДЧЫНЯЮЦЬ ПРЫЁМ НА**
**—ПАВЫШАНЫ СЭМІНАР СЦЭНАРЫСТЫХ—**
**для літаратараў, журналістых, маючых папярэдні вопыт сцэнарнай кіно-работы.**

**ПРЫЁМ НА СЭМІНАР** утвараецца ў праўленьні Белдзяржкіно (Савецкая, 90) у заг. курсамі сцэнарыстых штодзённа ад 2 да 4 гадз. дню ў памяшканьні курсаў (25-й школы імя Чарвякова, Савецкая дом № 43), з 7—9 гад. увечары.

Прыём заяў пачнецца з 12-га і скончыцца 16-га ліпеня г. г.

**Працяг заняткаў сэмінару 2 месяцы.**

**Адміністрацыя курсаў сцэнарыстых.**

**АБВЕСТКА**

**13 ліпеня г. г. роўна а 7 гадз. увеч у памяшканьні Гарсавету (Пляц Волі № 4, трэці паверх)**

**АДБУДЗЕЦЦА НАРАДА**

**членаў бюро сэкцыі Гарсавету, членаў бюро дэпутацкіх груп прадпрыемстваў гор. Менску сумесна з пазаштатнымі інструктарамі прымацаванымі для кіраваньня працай дэпутацкіх груп.**

**ПАРАДАК ДНЮ:**

1. Даклады дэпутацкіх груп прадпрыемстваў гор. Менску аб праробленай імі рабоце.
2. Аб справаздачнай кампаніі Гарсавету.

1—2

Нарсуд Бярэзінскага раёну, на падставе прысуду ад 8-га сакавіка г. г. па арт. 196-213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне члену Брадзецкага с.-с. Шаўцову Паўлу Кірылаву, за нядбайныя адносіны да вывазкі лесу.

Нарсуд Бярэзінскага раёну, на падставе прысуду ад 8-га сакавіка г. г. па арт. 196-213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне тэхніку Родаву Давыдаву Я. за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Нарсуд Бярэзінскага раёну, на падставе прысуду ад 26 лютага г. г. на арт. 196-213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбавньне сакратару Каплонецкага с.-с. Равенскаму Алесю Якубаву за нядбайныя адносіны на службовых абавязкаў.

Нарсуд Бярэзінскага раёну, на падставе прысуду ад 8-га сакавіка г. г. на арт. 196-213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне дзесятніку Лісьноўскаму Брониславу, за нядбайныя адносіны да службовых абавязаў.

Мензагс выклікае гр-на Гарахова Палікарпа Дзямянава на 4 жніўня г.г., па справе скасаваньня шлюбу з гр-кай Гараховай Аленай Ігнатавай.

Нарсуд Любаньскага раёну, на падставе прысуду ад 16-га сакавіка г. г., за дрэнныя адносіны да працы, якія выразіліся ў няпрыняцьці сваячасовых мер для належнага захаваньня сельскомскага збожжа абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне старшыні Турокскага сельсавету Марковічу Васілю Юркаву.

Нарсуд Лёзьнянскага раёну, на падставе прысуду ад 6 чэрвеня г. г. на арт. 195—213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр-ну Собалеву А. К. за нядбайнасьць у час дзяржурства пры тэлефоне.

Нарсуд Лёзьнянскага раёну, на падставе прысуду ад 24-га красавіка г. г. па арт. 196—213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр-ну Рыбакову Яказу Ф., Загадчыку складу Райкаапсаюзу, за адпраўку неспраўных сельска-гаспадарчых машын.

Нарсуд Копыскага раёну, на падставе прысуду ад 3-га чэрвеня г. г. па арт. 196 з санкц. 213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне загадчыку Копыскага кіно-тэатру Гурэвічу Якаву Паўлаву за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.


Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара—7-69, сакратара—4-78, сэктараў—6-15. Выдавецтва—2-44.
Падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў—6 р., на год—12 руб.

Глаўлітбел № 598 Друкарня імя СТАЛІНА